КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 12 (188)
◂ 2 КРАСАВІКА ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ВЯЛІКІ КЛОПАТ БАРЫСА КІТА

Стар. 6

**САМАКІРАВАННЕ Ў ВІРТУАЛЕ І РЭАЛЕ**

Грамадская ініцыятыва «За новыя Смалявічы» — спроба арганізаваць мясцовае самакіраванне ў беларускіх рэаліях

Стар. 4

**МАГНІТ ДЛЯ ТЭРАРЫСТАЎ**

Іспанскі ўрад і прэса сцвярджаюць, што ў Венесуэле актыўна дзейнічае цэнтр басксакай тэрарыстычнай групоўкі ЕТА

Стар. 12

**ПІЛІГРЫМКА МАСТАКА ЯЗЭПА ГОРЫДА**

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ДАКУМЕНТЫ З ІНТЭРНЭТА**

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ РОЗДУМ

# КРЫВАВЫ ТЫДЗЕНЬ РАСІІ

Вольга ХВОІН

**Тэрор спараджае тэрор. Развязвае рукі ахвярам для помсты і працягвае ланцуг злачынстваў. Расія другі дзесятак гадоў варыцца ў крыві этнічных канфліктаў, і канца і краю ім не відаць.**







Раніцай 29 сакавіка на платформах дзвюх станцый маскоўскага метро «Лубянка» і «Парк культуры» прагрымелі выбухі. У выніку загінула 39 чалавек, траўмы атрымалі каля сотні людзей. Ужо праз некалькі гадзін сілавікі заявілі, што тэракты ўчынілі жанчыны-смяротніцы. Праз дзень адбыўся яшчэ адзін тэракт у Дагестане. На гэты раз выбух у Кізляры забраў жыцці 12 чалавек, блізу 30 былі дастаўленыя ў бальніцы з пашкоджаннямі. Загаварылі пра «чачэнскі след» злачынства. Хаця ні суду, ні паўнавартаснага следства правядзена не было. Упаўнаважаны па правах чалавека ў Чачні Нурды Нухажыеў выступіў з заявай, што падобныя абвінавачванні правакуюць пераслед па нацыянальнай прыкмеце выхадцаў з Каўказа. «Перасцярогі выхадцаў з Чачэнскай Рэспублікі небезгрунтоўныя. У іх ёсць горкі досвед, калі іх па прыкмеце нацыянальнай прыналежнасці ўжо разглядалі як злачынцаў і адпаведна з імі абыходзіліся, прычым беспакарана», — падкрэсліў Нухажыеў.

Улады РФ самі сабе далі адмашку на працяг канфлікту на Паўночным Каўказе. І хіба іх дзеянні не падтрымаюць людзі, перапалоханыя, поўныя злосці і прагі помсты? Уладзімір Пуцін прыйшоў да прэзідэнцтва пад шум другой Чачэнскай кампаніі, але абяцаны ім мір так і не надышоў. Нягледзячы на афіцыйную адмену вясной 2009 года контртэрарыстычнай аперацыі, у рэгіёне спакайней не стала. Не спыніліся і лакальныя тэрарыстычныя акты. Расіі прадракаюць «трэцюю чачэнскую», але наўрад ці яна б паставіць кропку ў крывапраліцці.

Змагацца з тэрорам яго ж метадамі бессэнсоўна. Гэта толькі спараджае нянавісць і штурхае людзей да адказу, які зноў жа нясе смерць. Спрабуючы захаваць Каўказ у сваім падпарадкаванні, Расія ад пачатку 1990-х панесла жахлівыя страты ў чалавечым вымярэнні. Страх у грамадстве сярод простых людзей развязваў рукі палітыкам, у выніку зноў гінулі мірныя людзі па розныя бакі мяжы, і, што самае кепскае, гінуць дагэтуль.

Пасля выбуху ў Мінску 3 ліпеня 2008 года беларускія ўлады атрымалі маральны карт-бланш пад маркай пошуку тэрарыстаў на прэсінг апазіцыі (тады на допыты няслаба пацягалі і старую і маладую апазіцыйную гвардыю), масавую дактыласкапію і падазрэнне кожнага. Публічныя трагедыі дазваляюць стварыць які заўгодна вобраз унутранага ці знешняга ворага і адпаведна з ім змагацца, не рызыкуючы атрымаць асуджэнне. Бо хто асудзіць уладу, якая быццам бы дбае пра бяспеку сваіх грамадзян. Не кожны будзе і дакопвацца да ісціны. Галоўнае — знайсці вінаватага, а ім можна «прызначыць» любога, тым больш, калі палітычная сістэма непразрыстая.





Спачатку СМІ распаўсюдзілі інфармацыю, паводле якой Каўказскае падполле адмаўлялася ад датычнасці да выбухаў. Прадстаўнік так званага «Каўказскага эмірата» Шамсудзін Батукаеў заявіў, што не ведае, хто здзейсніў тэракты. Пазней у сеціве з'явіўся відэазапіс лідэра каўказскіх сепаратыстаў Доку Умарава, у якім ён заявіў, што тэракты ў маскоўскім метро былі арганізаваныя па яго асабістаму распараджэнню, і паабяцаў, што тэрарыстычныя атакі ў Расіі працягнуцца. Паводле слоў Умарава, тэрарыстычная акцыя ў метро была помстай за спецаперацыю федэральных сілаў, якая праходзіла 11 лютага 2010 года ў вёсках Аршты і Датых Сунжэнскага раёна Інгушэціі. Падчас аперацыі, па афіцыйных дадзеных, было забіта 18 баявікоў, таксама пацярпелі пяцёра мірных жыхароў, чацвёра з якіх памерлі. На момант напісання матэрыялу нічога не было вядома наконт дастевернасці запісу — экспертызу яго не праводзілі.

Але цікавы і факт таго, што ў СМІ з'явіліся сведчанні відавочцаў, якія заўважылі «ненармальнасць» руху цягнікоў непасрэдна перад выбухамі. Машыніст саставу, падарванага на станцыі «Парк Культуры», Дзяніс Бяляўскі распавёў, што некалькі цягнікоў той раніцай не выйшлі на лінію, што да моманту выбуху дзяжурная па станцыі загадала яму высаджваць пасажыраў. Інфармацыя пра магчымыя тэракты была ўжо вядомай? Чаму спецслужбы не паспрабавалі прадухіліць трагедыю?

Расія, якая жыве на бочцы з порахам і не вылазіць з тэрарыстычных актаў дагэтуль не мае дзейснай сістэмы бяспекі. Толькі калі клюнуў чырвоны певень, кіраўнік МНС Расіі Сяргей Шайгу паведаміў, што цягам бліжэйшых месяцаў будзе рэалізаваны пілотны праект па забеспячэнні бяспекі ў метро. Прэзідэнт РФ Дзмітрый Мядзведзеў падпісаў адпаведны ўказ. А няўжо да гэтага тэрактаў не было? Нечым нагадвае беларускую сітуацыю. Толькі пасля інцыдэнта на Дзень незалежнасці органы аховы правапарадку пачалі прымаць сапраўды дзейсныя меры падчас масавых акцый і мерапрыемстваў. Так, мажліва, яны і нязручныя, але ўсё ж лепш патрываць агляд на металашукальніку, чым атрымаць калецтва. Але гэты прынцып дзейсны толькі тады, калі вартаўнік не ёсць уласна злодзеем.

Тэрарызм сапраўды не мае межаў і нацыяў. Фатальны выпадак можа заспець у цягніку, тэатры, Алімпійскай вёсцы. Наўрад ці магчыма спрагназаваць і папярэдзіць дзеянні фанатыкаў і неадэкватаў усяго свету. Але ў выпадку Расіі яе кіраўніцтву, як мінімум, варта падумаць пра тое, што прымусіць жыць у суладдзі абсалютна розныя і антаганістычныя сусветы дзеля захавання тэрыторый, статускво — немагчыма.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЦЕБСК. «ЗАСЛУЖАНЫ БОМЖ БЕЛАРУСІ»

Так іншы раз называюць у прэсе праваабаронцу Валерыя Шчукіна. Нядаўна ён звярнуўся да старшыні Віцебскага аблсавета Аляксандра Касінца з пажаданнем вырашэння асабістай праблемы, а менавіта рэгістрацыі. Нагодай стала заява старшыні на прэс-канферэнцыі аб рэгістрацыі асобаў без вызначанага месца жыхарства. Пытанне гэта для Валерыя Аляксеевіча актуальнае, бо ў 2003 годзе Віцебскае ўпраўленне па грамадзянству і міграцыі, парушыўшы ўсе законы, выселіла яго з інтэрната, дзе ён пражываў і быў прапісаны. Такім чынам дэпутат ВС 13 склікання быў пазбаўлены месца пражывання і прапіскі, чаго не мае і зараз.

### МАСТЫ. ДЭПУТАТ ДАМОГСЯ

Паводле адказу на дэпутацкі зварот Дзмітрыя Кухлея, камунальшчыкі запланавалі работы па перакладцы каналізацыйнага стаяка ў адным з пад'ездаў дома № 11 А па вуліцы Будаўнікоў. Жыхары дома чакалі вырашэння праблемы болей за дваццаць гадоў. У 1988 годзе дом быў уведзены ў эксплуатацыю, і адразу ў жыхароў пачалі ўзнікаць праблемы з прарывамі каналізацыйнай трубы ў падвальным памяшканні. Трубу прарывала па некалькі разоў на месяц, што перашкаджала эксплуатацыі падсобных памяшканняў і стварала антысанітарныя ўмовы ў падвале. Жыхары дома вымушаны былі часта выклікаць адпаведныя службы ЖКГ, а часам самастойна ліквідавалі аварыю і праводзілі прыборку памяшкання. У сакавіку гэтага года быў арганізаваны збор подпісаў жыхароў дома пад адпаведным зваротам да камунальшчыкаў, і яны абяцаюць выканаць рамонтныя работы ўжо ў другім квартале 2010 года.

### ШАРКАЎШЧЫНА. ЗАРАБЛЯЮЦЬ НА НЯБОЖЧЫКАХ

Незвычайная аб'ява з'явілася ля ўвахода на могілкі ў вёсцы Бахіры. На ёй напісана: «Уваход — 500 рублёў. Уезд — 1000 рублёў». Цяпер мясцовым жыхарам, каб наведаць магілы сваякоў, неабходна сплаціць пэўную суму.

### ВІЦЕБСК. ПРЭСУ ПРАСУЮЦЬ

Спачатку супрацоўнікі Віцебскага РАУС затрымалі, а потым канфіскавалі 50 000 паасобнікаў выдання грамадзянскай кампаніі «Наш дом». А ў Дзень Волі на мяжы Расіі і Беларусі ў Віктара Рамнёва быў канфіскаваны ўвесь наклад газеты «Віцебскі кур'ер» — 10 тысяч асобнікаў, і ў Валерыя Шчукіна пад Гомелем — столькі ж зноў газеты «Наш дом».

---

ПРАЦЭС

## НА СВЕДАК ЦІСНУЦЬ

**На працэсе па справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў сведкі масава заяўляюць пра ціск на іх з боку следства з мэтай атрымаць доказы, якія кампраметуюць Мікалая Аўтуховіча.**

Паводле слоў праваабаронцы Алега Волчака, 29 сакавіка ў судзе дапыталі пяць сведак. «Прадпрымальнік з Оршы Ігар Пузікаў расказаў, што ў 2005 годзе спрабаваў перадаць Аўтуховічу ў турму запіску, каб атрымаць згоду на набыццё ў яго «дзвюх-трох адзінак аўтатэхнікі». Запіску Пузікаў прасіў перадаць знаёмага, супрацоўніка турмы Сяргея Шнітко, але той адмовіўся яе перадаваць. Аднак, паводле слоў Пузікава, следчыя прымусілі яго сказаць, што запіска ў турму ўсё ж патрапіла. Ён паказаў, што следчыя яму пагражалі, абяцалі хуткае вызваленне, і пад націскам ён даў патрэбныя следству паказанні, аднак у судзе ілгаць адмовіўся», — паведаміў Волчак.

Паводле слоў праваабаронцы, пра псіхалагічны ціск на следстве гаварыла і сведка Людміла Парэмская, былы бухгалтар фірмы Аўтуховіча. «Яна заявіла, што сказала б усё, што заўгодна, абы яе вызвалілі», — адзначыў Волчак. Ён падкрэсліў, што Парэмская таксама не пацвердзіла віну Аўтуховіча.

Былы «афганец» Канстанцін Уланаў расказаў пра тое, як сустракаўся з Аўтуховічам і Аляксандрам Ларыным у Мінску ў 2005 годзе. Паводле версіі следства, падчас гэтай сустрэчы яны сачылі за намеснікам міністра па падатках і зборах Васілём Каменкам, рыхтуючы на яго замах. «Аднак у судзе Уланаў заявіў, што ніхто ні за кім не сачыў. У турме на Уланава пачаўся псіхалагічны ціск, акрамя таго, у следчым ізалятары ён перанёс інфаркт», — расказаў Волчак.

«Абвінавачанне рассыпаецца на вачах. Я не ведаю, на што разлічвалі следчыя і дазнавальнікі, няўжо яны думалі, што сведкі ў судзе пра гэта не раскажуць? Але мяне турбуе, што гэтыя дзеянні ўчынялі супрацоўнікі элітнага падраздзялення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй. Калі яны так парушаюць закон, то што гаварыць пра следчых з раённых гарадоў і пасёлкаў... Усе гэтыя дзеянні можна расцаніць як дыскрэдытацыю праваахоўных органаў», — заявіў Алег Волчак.

Пры гэтым праваабаронца яшчэ раз адзначыў, што доказы, атрыманыя пад ціскам, не могуць быць пакладзены ў аснову абвінаваўчага прысуду.

Нагадаем, у Вярхоўным судзе разглядаецца крымінальная справа, па якой праходзяць Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка, Аляксандр Ларын і Міхаіл Казлоў. Першых трох абвінавачваюць у падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта ў дачыненні да намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Каменкі і былога старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі. Аўтуховіч і Асіпенка таксама абвінавачваюцца ў арганізацыі падпалу дома былога начальніка Ваўкавыскага РАУС Сяргея Кацубы ў 2004 годзе. Падпалкоўнік міліцыі Міхаіл Казлоў, былы кіраўнік УБАЗ па Гродзенскай вобласці, абвінавачваецца ў тым, што ведаў пра планы падрыхтоўкі тэрарыстычнага акта, але не прыняў мер па яго прадухіленні.

---

ВІНШАВАННЕ

## АЛЯКСЕЮ МАРАЧКІНУ — 70 ГАДОЎ

**30 сакавіка вядомаму мастаку і грамадскаму дзеячу Аляксею Марачкіну споўнілася 70 гадоў. З гэтай нагоды ў мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка адкрылася яго выстава.**



Выбар месца для выставы мастак тлумачыць тым, што ён парадніўся з полацкай зямлёй. Тут адбылася выстава, прысвечаная яго 50-годдзю, адсюль родам жонка мастака. Марачкін абышоў Полаччыну сцежкамі класіка нацыянальнага мастацтва Язэпа Драздовіча.

На адкрыцці выставы калегі і сябры мастака адзначалі разнастайнасць яго таленту, добразычлівасць і дынамізм, непахіснасць грамадзянскай пазіцыі.

Марачкін заклікаў беларусаў быць вартымі свайго вялікага мінулага і гаспадарамі свайго лёсу. Паводле яго слоў, становіча фарміруе чалавека і дапамагае яму, а страх — паралізуе.

Рэдакцыя «Новага часу» далучаецца да шчырых віншаванняў творцы і зычыць яму плёну, паразумення і аптымізму.

Дарэчы, выстава працуе да 2 мая. Пасля Аляксей Марачкін плануе паказаць яе ў шэрагу гарадоў Беларусі, а ў 2011 годзе — у Мінску.

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## БХД ТРЭНІРУЕЦЦА

Марыя КРУК

**Беларускія хрысціянскія дэмакраты выкарыстоўваюць кампанію па выбарах у мясцовыя саветы дэпутатаў як трэніровачны этап перад прэзідэнцкімі выбарамі.**

Сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі БХД Павел Севярынец паведаміў, што Нацыянальная Рада палітычнай структуры вырашыла цяперашнюю выбарчую кампанію выкарыстаць для павелічэння ліку прыхільнікаў БХД і сяброў арганізацыі. «Кожны дзень агітацыйнай кампаніі будзе дадаваць нам колькасць прыхільнікаў. З іх, як правіла, кожны другі становіцца актывістам БХД. Я разлічваю, што ў выніку кампаніі па выбарах у мясцовыя саветы мы атрымаем як мінімум 500 новых, актыўных сяброў», — цытуе словы палітыка БелаПАН.

Кандыдаты ад БХД будуць удзельнічаць у мясцовых выбарах прынамсі да датэрміновага галасавання. «З аднаго боку, такое рашэнне дазваляе нашым кандыдатам у дэпутаты працягнуць інфармацыйную і агітацыйную кампанію, з іншай — мы даем людзям магчымасць зняцца, калі ціск на іх апынецца невыносным. Сваім рашэннем мы падкрэсліваем, што ацэньваем гэтую кампанію як фарс, які тым не менш дае нам вызначаныя магчымасці», — заявіў Павел Севярынец.

Кіраўніцтва БХД упэўненае ў плённасці цяперашніх «электаральных трэніровак» і прапанавала Беларускаму Незалежніцкаму Блоку вылучыць адзінага кандыдата. Гонар быць адзіным ад БНБ мусіць выпасці таму, хто збярэ найбольшую ініцыятыўную групу. Як зазначыў Севярынец, хрысціянскія дэмакраты ўпэўненыя, што гэта будзе ім пад сілу: «Асноўныя высілкі мы накіруем на вылучэнне свайго кандыдата ў прэзідэнты. Ужо цяпер можам казаць, што БХД у стане сабраць сто тысяч подпісаў у прэзідэнцкай кампаніі, і мы будзем рабіць усё, каб адзіным кандыдатам ад БНБ стаў кандыдат ад БХД Віталь Рымашэўскі».

---

ІНІЦЫЯТЫВА

## НЕ — АЛКАГАЛІЗМУ!

**Актывісты Руху «За Свабоду» і «Правага альянсу» патрабуюць забараніць начны продаж спіртовых напояў.**

Ініцыятыву дэмакратычных актывістаў ужо падтрымалі 200 жыхароў Маскоўскага раёна Мінска.

Падпісанты калектыўнага звароту ў Мінгарвыканкам патрабуюць спынення гандлю алкагольнай прадукцыяй у начны час на тэрыторыі горада, і ў прыватнасці, забароны продажу спіртовых напояў начным аддзелам крамы № 28 ТАА «Азарэнне», што месціцца на вуліцы Бельская, 69.

На думку ініцыятараў кампаніі, продаж алкаголю ў любы час сутак спрыяе алкагалізацыі беларускага грамадства.

Паводле статыстыкі, у Беларусі 182 тысячы чалавек знаходзіцца на наркалагічным уліку ў органах аховы здароўя. Шаснаццаці тысячам падлеткаў пастаўлены дыягназ «хранічны алкагалізм». У 2009 годзе спажыванне алкаголю на кожнага беларуса ў пераліку на чысты спірт склала 14 літраў, што значна перавышае небяспечную мяжу ў 8 літраў, якую прыняла Сусветная арганізацыя аховы здароўя.

Актывісты «Правага альянсу» таксама падалі ў гарвыканкам заяўку на пікет, накіраваны супраць алкагалізму і наркаманіі. Актывісты намераны пратэставаць супраць вытворчасці і продажу ў краіне танных пладова-ягадных напояў, рэалізацыі алкагольнай прадукцыі ў начны час, а таксама свабоднага продажу неапрацаваных зярнят харчовага маку, якія змяшчаюць опіум. Пікет мае адбыцца 15 красавіка а 18 гадзіне на плошчы Бангалор.

**Паводле прэс-службы Руху «За Свабоду»**

---

ЗАПРАШЭННЕ

## ПАДАРОЖЖА Ў ГІСТОРЫЮ

**Антон Астаповіч запрашае жадаючых 18 красавіка наведаць помнікі Гомельшчыны.**

Падарожжа ў межах агульнанацыянальнай кампаніі «Будзьма беларусамі» арганізуе Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, старшынёй якога з'яўляецца актывіст Руху «За Свабоду» Антон Астаповіч.

Падчас выправы ў Міжнародны дзень аховы помнікаў і гістарычных мясцін плануецца наведаць шэраг мясцін:

Парычы — жылая і грамадзянская забудова мястэчка, будынкі лякарні, лесапрамыславіка,



жаночага вучылішча. Усё канец XIX — пачатак XX стагоддзяў.

Юравічы — касцёл і кляштар езуітаў, канец XVII — сярэдзіна XVIII стагоддзяў. Барока. Палеалітычная стаянка.

Барбароў — сядзібна-паркавы комплекс Горватаў, канец XVIII — сярэдзіна XIX стагоддзяў.

Мазыр — бернардынскі касцёл і кляштар, другая палова XVII — сярэдзіна XVIII стагоддзя; касцёл і кляштар цыстэрцыянак, пачатак XVII — сярэдзіна XVIII стагоддзя; касцёл цыстэрцыянцаў, сярэдзіна XVIII стагоддзя. Усё барока. Гарадская жыллёвая і грамадзянская забудова, канец XIX — пачатак XX стагоддзяў, музей «Палеская веда», музей А. Пушкара, краявіды горада і даліны Прыпяці.

Пра падрабязнасці можна даведацца па тэлефонах: (+37529) 1117332, (+37517) 2627343.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ГУД БАЙ, МАСКВА!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Гулялі, гулялі — і дагуляліся. Нарэшце афіцыйны Мінск зразумеў, што шматлікія гульні ў інтэграцыю ні да чаго не прывялі. У адзін дзень Аляксандр Лукашэнка двойчы катком праехаўся па Маскве. Па меркаванні спецыялістаў, Мінск больш у інтэграцыю не гуляе.**



Аляксандр Лукашэнка 30 сакавіка на нарадзе паводле вынікаў візіту ў Лацінскую Амерыку заявіў: «Так склалася сітуацыя пасля распаду СССР, што мы апынуліся ў сур'ёзнай залежнасці ад адной ці дзвюх краін па многіх пазіцыях. Ішлі гады, і як ні спрабавалі мы выбудаваць раўнапраўныя адносіны ў Саюзнай дзяржаве, ЕўрАзЭС, СНД, усё больш і больш пачалі праяўляцца тэндэнцыі старэйшага і малодшага брата».

Як заявіў Лукашэнка, апошнімі гадамі «праблемы тут узнікаюць, як кажуць, на роўным месцы і далёка не заўсёды вырашаюцца канструктыўна і хутка». «Прама скажу, парадаксальная сітуацыя складваецца ў адносінах з урадам Расіі, — адзначыў ён. — Рэч не ў тым, каб чарговым разам укалоць расійскі ўрад ці Пуціна. Мы бачым, колькі праблем не вырашаецца з-за суб'ектыўнай пазіцыі расійскага кіраўніцтва».

Паводле слоў Лукашэнкі, беларускі бок падпісвае сур'ёзныя дакументы, дасягае маштабных дамоўленасцей са сваім стратэгічным саюзнікам, але пры гэтым ніяк не атрымліваецца дамагчыся празрыстых і справядлівых умоў узаемнага гандлю. «Больш за тое, нашы крокі па пашырэнні супрацоўніцтва суправаджаюцца саркастычнымі каментарамі з іх боку», — сказаў беларускі кіраўнік.

А на сустрэчы з дзейным старшынёй АБСЕ, міністрам замежных спраў Казахстана Канатам Саудабаевым беларускі правадыр казаў аб недапушчальнасці выпустошвання асноватворнай ідэі Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. «Калі мы дамовіліся аб канцэптуальным палажэнні — аб тым, што ствараецца адзіная цэласная мытная тэрыторыя, то гэта значыць, што ніякія выключэнні і абмежаванні тут недапушчальныя — ні па якіх гандлёвых пазіцыях», — прыводзіць словы Лукашэнкі прэс-служба прэзідэнта.

Здавалася б, пры чым тут АБСЕ? Ні пры чым. Але шмат хто лічыць, што такім чынам Аляксандр Рыгоравіч намякнуў Казахстану аб гатоўнасці «сябраваць супраць Расіі». Больш за тое, эксперты ўсур'ёз пачалі казаць, што Беларусь задумваецца аб выхадзе з Мытнага саюза.

Сапраўды, калі асноўны аб'ём нафты будзе пастаўляцца з мытнымі пошлінамі, нам такі Мытны саюз не патрэбны. Улада ж губляе шмат чаго. Па-першае, згубіцца «беларускі эканамічны цуд», што не дадасць кіраўніцтву папулярнасці напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. А па-другое, не тое што не дададуць папулярнасці, але выклічуць нават нянавісць новыя мытныя пошліны на еўрапейскія аўтамабілі. Як бы ні называлі чыноўнікі іх «аўтахламам», усё роўна гэты «аўтахлам» значна лепшы за прадукцыю АўтаВАЗа, які хутка зойме лідзіруючыя пазіцыі на рынку каляровых і чорных металаў.

Партыя БНФ ужо ўхапілася за гэтую тэму, абвясціўшы стварэнне ініцыятыўнай групы па правядзенні рэферэндуму супраць пошлін. Але пакуль што гэтая праца ідзе паволі. Затое простыя грамадзяне стварылі грамадскае аб'яднанне «За аўто», асноўнай мэтай якога пакуль з'яўляецца захаванне мытных пошлін на ўзроўні 2009 года.

Як паведаміў прэсе старшыня аргкамітэта па стварэнні аб'яднання Арцём Шаркоў, напачатку мая нас чакае відовішчнае шоу: аўтапрабег з перадачай подпісаў за захаванне мытных пошлін у дзяржаўныя ўстановы, у тым ліку і ў Адміністрацыю прэзідэнта.

Так што ва ўлады ёсць шанец прыгожа выйсці з Мытнага саюза «па просьбах працоўных». Ці, прынамсі, захаваць сённяшнія мытныя пошліны на аўто ў адказ на захаванне пошлін на нафту.

Тым часам кампанія па выбарах у мясцовыя саветы ў Беларусі ўступіла ў самую актыўную фазу — у фазу агітацыі. Аднак наўрад ці мы пабачым на гэтых выбарах нейкія сюрпрызы і навацыі. Нават нягледзячы на тое, што Нацыянальная Рада БХД у нядзелю прыняла рашэнне аб далейшым удзеле ў мясцовых выбарах, ва ўсялякім разе, да датэрміновага галасавання. Проста таму, што гэтыя выбары нікога не цікавяць.

Праваабаронцы, якія праводзілі маніторынг рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, заяўляюць, што ўсяго па краіне зарэгістраваныя 25 033 кандыдаты ў дэпутаты мясцовых саветаў. «Калі браць па ўсёй краіне, гэта толькі 1,1 кандыдата на кожную выбарчую акругу. З аднаго боку, гэта сведчыць пра тое, што грамадства не ўспрымае мясцовыя саветы як рэальны орган улады і не лічыць выбары свабоднымі, з другога — што працэс вылучэння кандыдатаў у дэпутаты быў арганізаваны «вертыкаллю». Няма такіх акруг, у якіх адсутнічалі б кандыдаты ў дэпутаты. Па кожнай акрузе хтосьці ды балатуецца», — лічыць старшыня Беларускага Хельсінкскага камітэта Алег Гулак.

Апроч таго, па яго меркаванні, складана будзе пабачыць і пікеты кандыдатаў у дэпутаты. Справа ў тым, што ў Выбарчы кодэкс унесена норма пра тое, што агітацыйныя пікеты кандыдатаў у дэпутаты могуць праводзіцца ў любых не забароненых для гэтага месцах. Раней «пікеты кандыдатаў у дэпутаты сталі ўсюды, дзе можна, але міліцыя глядзела на гэта скрозь пальцы і не пыталася ў людзей дазволу на правядзенне пікета. Сёння ж мясцовыя органы ўлады павінны вызначыць спіс месцаў, дзе пікеты праводзіць забаронена. «На справе гэта выльецца ў тое, што пікеты забараняюцца ў любых людных месцах. Такім чынам, дэмакратызацыя Выбарчага кодэкса можа быць выкарыстана на шкоду выбарчай кампаніі», — лічыць Гулак.

Акрамя таго, цікавую думку на тыдні выказалі псіхолагі. Забаранальныя меры могуць актывізаваць цікавасць моладзі да азартных гульняў або гей-парада. Пра гэта заявіла прарэктар па выхаваўчай працы Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі кандыдат псіхалагічных навук Аксана Папова.

Адказваючы на пытанне адносна магчымага правядзення гей-парада ў Мінску, яна зазначыла, што цікавасць маладых людзей у падлеткавым і раннім юнацкім узросце заўсёды арыентаваная на навізну і забароны. «Забарона можа выклікаць выбух актыўнасці сярод моладзі, — сказала яна. — Неабходна наладзіць дыялог з моладдзю, паказаць негатыўныя і пазітыўныя бакі якой-небудзь падзеі, уключыць моладзь у самастойны пошук аргументаў». Такім чынам, паводле слоў спецыяліста, у маладых людзей фарміруецца актыўная жыццёвая пазіцыя.

Дык, можа, нам трэба было б забараніць мясцовыя выбары?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### УЛАДЗІМІР АРЛОЎ


www.labadzenka.by

Уладзімір Арлоў — аўтар многіх мастацкіх твораў на гістарычную тэматыку — узнагароджаны прэміяй «Еўрапейскі паэт свабоды». Цырымонія адбылася ў Гданьску. Журы конкурсу амаль аднагалосна падтрымала кандыдатуру беларускага пісьменніка. Уладзімір Арлоў прадстаўляў Беларусь на агульнаеўрапейскім конкурсе «Еўрапейскі паэт свабоды» з кнігай вершаў «Паром праз Ла-Манш». З сарака шасці еўрапейскіх краін для ўдзелу былі выбраныя сем: Беларусь, Кіпр, Славакія, Славенія, Сербія, Францыя, Швецыя, а восьмая — Польшча. З кожнай краіны-фіналіста выбралі па адным паэце, чыю кніжку пераклалі і выдалі па-польску.

Кнігу Уладзіміра Арлова «Паром праз Ла-Манш» намінаваў вядомы польскі перакладчык Адам Паморскі. Арганізатарам конкурсу «Літаратурная прэмія «Еўрапейскі паэт свабоды» з'яўляецца муніцыпалітэт Гданьска. Прэмія прызначаецца раз на два гады. Лаўрэата чакае ўзнагарода ў памеры сто тысяч злотых.

### СЯРГЕЙ ГАЙДУКЕВІЧ


Photo.ByMedia.Net

Лідэр Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргей Гайдукевіч стварае блок «Новая Беларусь — Адзінства», а таксама разглядае варыянты свайго ўдзелу ў бліжэйшай прэзідэнцкай кампаніі. «Я накіраваў ліст на імя кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімера Макея, — паведаміў Гайдукевіч «Радыё Свабода». — Мы просім дазволу на арэнду Палаца рэспублікі для правядзення там кангрэсу з удзелам 2,5 тысяч дэлегатаў. Нас задавальняе любы ўік-энд, пачынаючы ад 20 мая і да канца ліпеня. Мы запрашаем на форум гасцей з «Адзінай Расіі», «Справядлівай Расіі» і ЛДПР, а таксама з Партыі рэгіёнаў».

Калі Палац рэспублікі пад гэтае мерапрыемства арэндаваць не атрымаецца, то арганізатары кангрэсу згодныя скараціць колькасць дэлегатаў да тысячы і правесці яго ў кіна-канцэртнай залі «Мінск». «Думаю, што наш зварот будзе чарговым тэстам для ўладаў на лібералізацыю сітуацыі ў Беларусі», — зазначае палітык, які, праўда, ніколі ў асаблівай апале ў дзейснага кіраўніцтва краіны і не быў.

Спадар Гайдукевіч сказаў, што пакуль не мае права называць канкрэтных удзельнікаў новага блоку. Але жадаючых у яго ўступіць нават болей, чым ён чакаў. Апроч стварэння новай грамадскай арганізацыі, на мерапрыемстве будуць разглядацца яшчэ два пытанні: зацвярджэнне праграмы і складу ініцыятыўнай групы патэнцыйнага кандыдата ў прэзідэнты Беларусі ад ЛДП Сяргея Гайдукевіча.

### МІХАІЛ ЦЫГАН



У Мінскім абласным судзе вядуцца слуханні па крымінальнай справе ў дачыненні да былога кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёна сталіцы Міхаіла Цыгана. Чыноўніка абвінавачваюць па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэкса: атрыманне хабару, крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, перавышэнне ўлады і службовых паўнамоцтваў, а таксама незаконныя дзеянні ў дачыненні агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў.

Як прагучала ў судзе, ужо былы кіраўнік адміністрацыі аднаго з раёнаў сталіцы пагаджаўся на любую «падзяку» за сваю дапамогу ў вырашэнні спраў. Кажуць, што хабар браў і каўбасою, і памперсамі, і бензінам. А ў якасці падарункаў не адмаўляўся ад алкаголю і арганізацыі вольнага часу, напрыклад наведаць сауну. Таксама Міхаіл Цыган надзвычай раўніва ставіўся да чужога заробку і перыядычна збіраў з падначаленых чыноўнікаў грошы быццам бы на розныя мэты, а насамрэч забіраў іх сабе.

Каб агучыць усе абвінавачванні па справе, спатрэбілася каля гадзіны, дзяржабвінаваўца нават папрасіў перапынак.

Міхаіл Цыган быў прызначаны кіраўніком Беларусі старшынёю адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Менска 17 жніўня 2005 года. Да гэтага ён працаваў першым намеснікам кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна. Чыноўнік таксама з'яўляецца сябрам прэзідыума Беларускай федэрацыі горналыжнага спорту і сноўборда, якую ўзначальвае намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч.

▸ ВЫБАРЫ

# ДЭПУТАЦКІЯ МАНДАТЫ НЕПАПУЛЯРНЫЯ

Вольга ХВОІН

**Эксперты маніторынгу этапу рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў 26-га склікання выявілі пэўныя паляпшэнні ў правядзенні выбарчай кампаніі. Аднак гэтых зрухаў недастаткова, каб лічыць яе цалкам свабоднай.**



www.svaboda.org

Адзін з найбольш працаёмкіх этапаў любой выбарчай кампаніі — збор подпісаў — прайшоў у адносна спакойнай атмасферы. Не было масавых затрыманняў і перашкодаў у працы ініцыятыўных груп. Праўда, не паўсюль зборшчыкі подпісаў змаглі патрапіць — інтэрнаты і вайсковыя часткі па-ранейшаму заставаліся ў зоне недасягальнасці, хаця Выбарчы кодэкс дазваляе кандыдатам працаваць там з выбарцам, хоць і з пэўнымі абмежаваннямі. Разам з тым аўтары справаздачы сцвярджаюць, што «ў параўнанні нават з кампаніяй па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу, назіраўся большы ціск на прэтэндэнтаў і на сяброў ініцыятыўных груп з боку выбарчых камісіяў і па месцы іх працы ці вучобы».

Напрыклад, сябра ініцыятыўнай групы па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» з Бабруйска Вячаслава Шэлега, які збіраецца балатавацца на выбарах, выклікалі ў аддзел гандлю гарвыканкама, дзе паставілі перад выбарам: ідзеш на выбары ці працуеш. Яго паплечніка па палітструктуры Аляксандра Кабяка звольнілі з працы ў казіно пасля таго, як былі пададзеныя дакументы на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы.

З пазітыўных навін — скарачэнне колькасці адмоў у рэгістрацыі ініцыятыўных груп. У 2007 годзе іх было больш за сто, сёлета — 23. На думку аўтараў справаздачы, гэтыя лічбы сведчаць, што выбарчыя камісіі не імкнуліся ствараць перашкоды ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп. Хаця факты адмовы ў рэгістрацыі мелі месца. Падставамі для гэтага збольшага былі факты таго, што дакументы падаваліся не ўласна асобамі, якія маюць намер вылучацца ў якасці кандыдатаў, а таксама парушэнне прынцыпу «свабоднага ўдзелу ў выбарах».

Да прыкладу, Астравецкая акруговая выбарчая камісія двойчы адмовілася рэгістраваць ініцыятыўную групу сябра АГП Івана Крука, які меў намер вылучацца кандыдатам у дэпутаты Астравецкага раённага савета. Афіцыйна актывіста абвінавацілі ў тым, што нібыта пры фармаванні ініцыятыўнай групы ён «парушыў прынцып свабоднага ўдзелу ў выбарах», і сябры яго ініцыятыўнай групы не па сваёй волі былі заангажаваныя ў кампанію. Іван Крук высветліў, што на асобаў, якія адмовіліся пасля ад свайго ўдзелу ў выбарах, ціснулі супрацоўнікі райвыканкаму — абяцалі ўнесці ў так званыя «чорныя спісы».

Агулам адмовы ў рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты з 25 375 прэтэндэнтаў атрымалі 318 чалавек. «Але, калі мы будзем разглядаць сітуацыю адносна прадстаўнікоў апазіцыйных партый, частка якіх вылучалася на партыйных сходах, а таксама шляхам збору подпісаў, бо некаторыя суб'екты як Беларуская хрысціянская дэмакратыя не маюць рэгістрацыі, а рух «За свабоду» вылучаў сваіх сяброў як грамадскае аб'яднанне, то ў рэгістрацыі было адмоўлена 90 сябрам з 290, што складае 26 працэнтаў. Гэта даволі вялікі працэнт», — зазначыў юрыст праваабарончага цэнтру «Вясна» Валянцін Стэфановіч і адзін з удзельнікаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».

Сёлета ў якасці кандыдатаў у дэпутаты было зарэгістравана 513 прадстаўнікоў палітычных партый. У параўнанні з папярэднімі выбарамі 2007 года колькасць зарэгістраваных кандыдатаў ад палітычных партый вырасла амаль у 3 разы (са 177 да 513 чалавек), аднак і гэтая лічба не ўражвае — усяго толькі 0,02 працэнта ад агульнага ліку прэтэндэнтаў на дэпутацкія мандаты. Найбольш кандыдатаў вылучылі праўладная Камуністычная партыя Беларусі, Беларуская партыя левых «Справядлівы свет», Аб'ядная грамадзянская партыя, БНФ, Ліберальна-дэмакратычная, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада), незарэгістраваная Беларуская хрысціянская дэмакратыя таксама ў лідэрах па колькасці вылучэнцаў. Аднак конкурс на дэпутацкі мандат невялікі — прыблізна 1,2 чалавека. У Мінску, Мінскай і Магілёўскай абласцях паказчык вышэйшы, але ў цэлым можна гаварыць, што ў шэрагу акругах выбары будуць безальтэрнатыўнымі.

Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў дваццаць шостага склікання адбудуцца 25 красавіка. Старшыня Цэнтрвыбаркаму Лідзія Ярмошына паведаміла, што Беларусь міжнародных назіральнікаў на мясцовыя выбары запрашаць не будзе.

▸ ІНІЦЫЯТЫВА

# САМАКІРАВАННЕ Ў ВІРТУАЛЕ І РЭАЛЕ

Марыя КРУК

**Беларусь з сістэмай самакіравання знаёмая аж з XIV стагоддзя, калі Магдэбургскае права было распаўсюджана на гарады Вялікага княства Літоўскага. Аднак цяпер палітыка ці ўдзел у справах дзяржавы не ў павазе. Асобныя «гарачыя галовы» спрабуюць разварушыць гэты закамянелы пласт дзейнасці, і хутка прыходзіць асэнсаванне, што пачынаць трэба з простага: давесці, што чалавек — гаспадар на сваёй зямлі, у сваім горадзе.**

Грамадская ініцыятыва «За новыя Смалявічы» — спроба арганізаваць мясцовае самакіраванне ў беларускіх рэаліях, то бок не прывязваючы яго да палітыкі ні лакальнага, ні агульнанацыянальнага ўзроўню. Каардынатар ініцыятывы Яўген Пугач атрымаў някепскую адукацыю, у тым ліку і за мяжой, але вярнуўся ў родны горад і вырашыў паспрабаваць змяніць тое, што яго не задавальняе. Але не чакаючы, пакуль на гэта будзе дадзеная «адмашка» мясцовай вертыкалі.

— На мінулых прэзідэнцкіх выбарах я быў кіраўніком мясцовага штаба Мілінкевіча. Калі збіралі подпісы, то зразумеў маштабы агульнай абыякавасці да ўсяго, што адбываецца, — і да палітыкі ў цэлым, і да спраў свайго горада. Людзі прызвычаіліся, што ўсё можна атрымаць ад дзяржавы, а каб самім паварушыцца, то не. Тады была надта папулярная тэза свабоды, і мы правялі апытанне, што ж такое свабода для смалявічан. Выявілася, што пра дэмакратыю размова не вядзецца. Усё больш празаічна. Нехта гаварыў, што свабода — гэта магчымасць не ісці ў войска, нехта, што гэта — выбар розных тэлевізійных каналаў. Мы бачылі, што да ўсяго патрэбная нейкая асветніцкая дзейнасць. Спачатку стварылі інтэрнэт-партал «За новыя Смалявічы», пасля — бюлетэнь «Горад наш». Сябры грамадскай ініцыятывы перыядычна пішуць запыты ў розныя інстанцыі па нейкіх праблемах, затым публікуюць адказы чыноўнікаў на сайце і ў бюлетэні. Гэтыя крыніцы інфармацыі на 80 працэнтаў запоўненыя мясцовымі навінамі. Ёсць матэрыялы і з афіцыйных крыніц — напрыклад, аб карупцыянерах.

Цяпер на інтэрнэт-партале можна знайсці звесткі пра сам горад, мясцовыя падзеі, даведацца, якія праблемы ёсць у жыхароў Смалявічаў, і пры жаданні далучыцца да іх вырашэння. Напрыклад, у горадзе няма аўтаномнага пераезду праз чыгунку, што падзяляе Смалявічы надвое. Калі ідзе цягнік ці здараюцца нейкія транспартныя збоі, то ў чарзе перад пераездам стаяць і машыны жыхароў, і хуткая дапамога, і МНС.


Яўген Пугач

— У нас, як едзеш да каго ў госці ў іншую частку горада, прынята гаварыць: «Буду праз 10 хвілін, калі пераезд не закрыюць». Будаўніцтва моста праз чыгунку было запланавана яшчэ ў 1993 годзе, але ўлады дагэтуль не знаходзяць на яго сродкаў. З дапамогай інтэрактыўнай гульні «Пабудуй мост» на партале мы збіраем прапановы, як вырашыць праблему адсутнасці аўтаномнага пераезду праз чыгунку ў горадзе. У 2008 годзе мы правялі апытанне гараджан наконт праблем горада. Атрымалі прыкладна дзвесце анкет, апрацавалі іх, і атрымалася, што людзей турбуюць праблемы з асвятленнем на вуліцах, кепскія дарогі, пераезд праз чыгунку, пра які ўжо гаварыў, адсутнасць дзіцячага садка ў адным з раёнаў. Калі ў Смалявічы прызначылі новага старшыню выканкаму, дык той сам выказваўся, што не чакаў такой безгаспадарлівасці. Некаторыя праблемы з часам вырашылі — паклалі асфальт, зрабілі асвятленне. Магчыма, прычыны ў тым, што ладзілася свята горада, ці што прыйшоў новы кіраўнік, а магчыма, і мы ў нечым гэтаму паспрыялі. Прынамсі пасля гэтага нас нават крыху пачалі паважаць.

Сярод актывістаў грамадскай ініцыятывы ёсць прыхільнікі пэўных партый, палітычных рухаў, прафсаюзаў, але гэта асабліва не афішуецца. Хаця гарадок невялікі. і, як гаворыць Яўген, народ і так памятае, што ты «нейкі апазіцыянер», бо збіраў, напрыклад, подпісы.

— Мы зрабілі календары з выявамі роднага горада, і калі раздавалі іх, то некаторыя нават баяліся браць. Гаварылі: «Гэта ўсё Амерыка ваша робіць». Каб мець давер людзей, трэба весці максімальна празрыстую дзейнасць, паказваць нейкі вынік. І быць такім жа, як людзі, а не дыстанцыявацца ад іх, — тлумачыць Яўген (між іншым, псіхолаг і палітолаг па адукацыі) спецыфіку грамадскай працы. — Агулам насельніцтва хоча жыць, выжываць. Моладзь усё больш цікавіцца, як можна з'ехаць, часам нават у мяне пытаюцца парады на гэты конт. Хто мае ідэі, нейкія грошы — спрабуе адчыніць сваю справу, нехта ўдаецца ў творчасць. Мне падаецца, што людзей проста дастала існая сістэма ўлады, бо не бачна перспектыў, не бачна тых, хто прыйдзе і дапаможа ім, а самі вырашаць праблемы не навучыліся. Дарэчы, заўважыў, што апошнім часам што ні дай, усё чытаюць — улёткі, бюлетэні, газеты. Сапраўды, нас ратуе інтэрнэт — з ім крыху весялей жыць.

На жаль, сябры грамадскай ініцыятывы кантактаў з кіраўніцтвам горада амаль не маюць. «Як сказаў адзін чыноўнік, не любяць і не даверяюць нам, — гаворыць Яўген Пугач. — Мы перашкаджаем сваёй актыўнасцю, ім патрэбныя цішыня і спакой. Спрабавалі зрабіць круглы стол наконт пабудовы мосту. Паведамілі мясцоваму ідэолагу пра месца сустрэчы, запрасілі і яго, а пасля ўладальнікі памяшкання паведамілі, што мы не зможам там сустрэцца. А можа і сапраўды баяцца нас, бо любы мог нажыцца не адзін раз на рамонтах садкоў-школаў, а тут мы, і «капаем», і патрабуем нейкай справаздачнасці. Пройдзе час, і цяперашнія чыноўнікі будуць прызнаваць, што мы мелі добрыя ідэі. А пакуль так, як ёсць. Калі зрабілі афіцыйны выканкамаўскі сайт, і была яго прэзентацыя, адзін з намеснікаў пачаў крытыкаваць, што зрабілі халтуру. І ў якасці ўзору добрай працы прыводзіўся наш сайт».

Аднак Яўген, якому, здаецца, сам Бог раіў бы быць дэпутатам мясцовага савета, красавіцкія выбары ігнаруе. «Мне няма часу займацца гэтым, хапае працы ў межах ініцыятывы, да таго ж трэба зарабляць грошы на жыццё. Але галоўнае — я не маю ўпэўненасці, што можна прайсці ў Савет, не веру ў празрыстасць працэдуры і не думаю, што варта марнаваць дзеля гэтага час. Справай можна займацца і без дэпутацкага мандата», — упэўнены каардынатар смалявіцкай ініцыятывы.




# НОВАЯ ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА: «НАКАТВАЦЬ» І НЕ СПАЦЬ У ШАПКУ

Вольга ХВОІН

**«Расія падтрымлівала і будзе падтрымліваць і дапамагаць Беларусі. У тым ліку крэдытамі», — заявіў пасол Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў падчас сустрэчы з журналістамі. Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка са скрухай канстатуе, што раней мы «спалі ў шапку» і не бачылі партнёраў апроч Расіі, і ставіць амбітную задачу наладжваць новыя сувязі на мацерыках і кантынентах Зямлі.**

Па словах дыпламата, Расія не збіраецца купляць лаяльнасць Беларусі, каб палепшыць двухбаковыя адносіны. «Мы захоўвалі пераемнасць з часоў СССР у пытаннях паставак энерганосьбітаў з некаторымі суб'ектамі прэферэнцыйнага характару. У 2006 годзе Расія вырашыла перайсці на рынкавыя ўмовы гандлю энерганосьбітамі. Калі пад гэтым разумець імперскія амбіцыі, то я прашу прабачэння», — зазначыў Сурыкаў.

На яго думку, размова ідзе пра раўнапраўныя і ўзаемавыгадныя адносіны. Напрыклад, дамагаючыся льготных коштаў на энергарэсурсы Беларусь адначасова вядзе з Расіяй выгадны для сябе эканамічны дыялог па продажы сваёй прадукцыі — малака, сельскагаспадарчай тэхнікі. «Мы ж не просім прадаваць нам малако ў два разы танней», — падкрэсліў дыпламат.

Спрэчкі на глебе паставак энергарэсурсаў Аляксандр Сурыкаў лічыць нармальным працэсам, галоўнае — «сфармаваць разумныя адносіны ажно да сумеснага бізнесу, каб абодвум бакам было выгодна». І факт таго, што Беларусь падала іск у Эканамічны суд краінаў СНД па пытаннях мытаў на нафту, пасол лічыць абсалютна нармальнай з'явай: «Раней гэтыя ўсе супярэчнасці выліваліся ў медыйную сферу, якая нічога не вырашае. Цяпер усё больш цывілізавана. Хай пытанне разгледзяць юрысты». Да слова, дыпламат сказаў, што яму прыносіць задавальненне прагляд беларускіх тэлеканалаў, дзе часам «мочаць Расію». «Гэта нармальна, важна, каб было агульнае паразуменне», — мяркуе пасол Расіі.

Аднак, нягледзячы на намеры «дапамагаць Беларусі», усходняя суседка пра свае інтарэсы не забываецца. Так, Аляксандр Сурыкаў паведаміў, што Расія можа адмовіцца ад удзелу ў будаўніцтве беларускай АЭС, калі ў фінансаванні праекту будзе ўдзельнічаць Кітай. «Мы не хочам дзяліцца тэхналогіямі, якія каштуюць грошай, з кітайскімі фірмамі, многія з якіх маладыя на гэтым рынку. Новыя тэхналогіі трэба купляць, а кітайцы, у мяне такое адчуванне, хацелі б іх падгледзець. Калі яны будуць удзельнічаць, то расійскі бок прапануе перагледзець некаторыя моманты», — дадаў дыпламат. Паводле яго слоў, прымальным быў бы варыянт, калі РФ будзе займацца непасрэдна тэхнічнай часткай станцыі, а кітайцы, напрыклад, будаўніцтвам гарадка для атамшчыкаў. Цяпер Беларусь і Расія рыхтуюцца да падпісання кантракта на будаўніцтва АЭС, абмяркоўваецца цана будаўніцтва.

Таксама Аляксандр Сурыкаў нагадаў, што з першага ліпеня бягучага года ў рамках Мытнага саюза краіны мусяць выйсці да мяжы з Еўрапейскім саюзам праз Беларусь. «З правільным падыходам мы атрымаем больш канкурэнтаздольную эканоміку, наша галоўная задача — праз рэгуляванне імпарту стварыць спрыяльныя ўмовы для вытворцаў. У 2012 годзе чакаецца ўвогуле пераход да адзінай эканамічнай прасторы», — нагадаў дыпламат, а таксама падкрэсліў, што «інтэграцыя паміж Беларуссю і Расіяй хоць і развіваецца не без складанасцяў, але гаварыць аб яе звароччванні — рана».

Між тым на днях кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас нарады па выніках свайго візіту ў Венесуэлу і Бразілію назваў парадаксальнай сітуацыю, якая складваецца ў адносінах з урадам Расіі, і абвінаваціў расійскі кабінет міністраў у вырашэнні праблем з Беларуссю з пазіцыі суб'ектыўнага характару. «Не трэба ў выступе і заяве гаварыць пра расійскі народ, пра Расію. Расія занадта разнародная, і той, хто кіне камень у расійскага чалавека, будзе нішчымным чалавекам, — сказаў Лукашэнка. — Іншая справа, тая пазіцыя, якую займае расійскі ўрад». Паводле кіраўніка Беларусі, у адносінах паміж дзвюма дзяржавамі ёсць праблемы, і яны не вырашаюцца, таму Беларусь і шукае новых партнёраў, у тым ліку і за акіянам. «Мы бачым, колькі праблем сёння не вырашаецца або вырашаецца з пазіцыі суб'ектыўнага характару з боку ўрада Расіі. Мы ні на каго не накатваем, мы проста пачынаем шукаць іншыя нішы і краіны, дзе нас успрымаюць і разумеюць, — патлумачыў Лукашэнка новыя міждзяржаўныя стасункі. — Менавіта таму сёння, як ніколі, мы вымушаныя актыўна працаваць у любым, нават самым аддаленым кутку свету, дзе мы можам разлічваць на прадказальныя і сумленныя ўмовы ўзаемавыгадных гандлёва-эканамічных сувязяў. На Расіі і Еўропе свет клінам не сышоўся, трэба выходзіць у іншыя рэгіёны са сваёй прадукцыяй і праектамі».

У якасці патэнцыйных дзелавых партнёраў кіраўнік Беларусі разглядае не толькі краіны Лацінскай Амерыкі, але і Афрыкі. Таксама беларускі ўрад атрымаў указанне развіваць кантакты з краінамі Паўднёва-Усходняй Азіі, Персідскага заліва і Індыяй.

ГЕАПАЛІТЫКА

# ЛУКАШЭНКУ ЗАПРАСІЛІ НА САМІТ АБСЕ

Марыя КРУК

**На гэтым тыдні Беларусь з афіцыйным візітам наведаў дзейны старшыня АБСЕ, дзяржаўны сакратар — міністр замежных спраў Казахстана Канат Саудабаеў. Дыпламат сустракаўся з прадстаўнікамі афіцыйнага Мінска, а таксама апазіцыі. І ў выніку прыйшоў да высноў, што ў Беларусі «даволі добрая сітуацыя», калі апаненты могуць вольна ўдзельнічаць у дыскусіі. Праўда, не ўлічыў, што магчымасці для такога абмену думкамі з'яўляюцца ў асноўным толькі з падачы Захаду, а не мясцовых уладаў.**

Падчас сустрэчы з апазіцыйнымі палітыкамі прагучала прапанова аднавіць пляцоўку АБСЕ для правядзення дыялогу ўнутры Беларусі, як гэта было напрыканцы 90-х гадоў. Нагадаю, што ў 1999 годзе пад эгідай АБСЕ быў арганізаваны дыялог паміж партыямі і прадстаўнікамі адміністрацыі прэзідэнта. На разнастайныя мерапрыемствы па яго забеспячэнню Еўропа, па некаторых падліках, выдаткавала каля 1,5 мільёна долараў. Аднак добрыя намеры нічым не скончыліся. Улады не выканалі ні адну з умоў, якія ставіла апазіцыя. Сёлета новы кіраўнік Офіса АБСЕ ў Мінску пасол Бенедыкт Халер у адным са сваіх інтэрв'ю заявіў, што адной з задач Офіса з'яўляецца «падтрыманне раўнавагі» і ўраду ў вядзенні дыялогу з грамадскімі структурамі. Праўда, яго папярэднік на гэтай пасадзе меў нямала крытыкі за лаяльнасць да беларускага рэжыму.

Як расказаў лідэр аргкамітэта па стварэнні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалай Статкевіч, тэма сустрэчы з Канатам Саудабаевым не была выразна акрэсленая, і ў выніку ўсё звялося да правядзення ў Беларусі выбараў. Да слова, назіральнікі ад АБСЕ не будуць запрошаныя на мясцовыя выбары ў красавіку гэтага года. Па выніках парламенцкіх выбараў 2008 года АБСЕ зрабіла заключэнне, што яны не адпавядалі стандартам арганізацыі. Тады кіраўніца назіральнай місіі БДІПЧ АБСЕ Ан-Мары Лізен адзначыла некаторыя паляпшэнні ў выбарчым працэсе, але падкрэсліла, што некалькіх пазітыўных зрухаў недастаткова, каб цалкам адпавядаць стандартам АБСЕ.

Паколькі ў сустрэчы на гэтым тыдні ўдзельнічалі не толькі прадстаўнікі апазіцыі, але і праўладных структур, то дыпламат меў магчымасць выслухаць усе бакі, і ў выніку прыйшоў да высновы, што «ў Беларусі даволі добрая сітуацыя, калі адбываецца вострая дыскусія прадстаўнікоў розных апазіцыйных і праўладных структур», — цытуе Статкевіча БелаПАН. І пасля падыходу да прэсы кіраўнік АБСЕ не зрабіў сенсацыйных заяў. Візіт меў на мэце зандаж глебы, а не прад'яўленне ўмоў Мінску для далейшай супрацы з Еўрапейскім саюзам. Што не пашкодзіла запрасіць кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнку на саміт нефармальнай сустрэчы Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, які адбудзецца летам у Казахстане, падчас якой плануецца разгледзець тэматыку і арганізацыйныя аспекты правядзення саміту кіраўнікоў дзяржаў АБСЕ, што таксама прызначаны на лета ў Казахстане.

Апроч таго, падчас візіту ў Беларусь Каната Саудабаева беларускія праваабаронцы звярнуліся ў Офіс АБСЕ да Бенедыкта Халера з заявай па справе Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі, крымінальны працэс над якімі праходзіць у Вярхоўным судзе Беларусі. Цяпер ідзе допыт сведак па справе, і многія з іх адмаўляюцца ад ранейшых паказанняў, матывуючы гэта ціскам следства. Беларускія праваабаронцы лічаць, што Аўтуховіч і Асіпенка беспадстаўна абвінавачаныя ў падрыхтоўцы замаху на былога губернатара Гродзенскай вобласці, і доказаў іх віны няма. Абвінавачваным пагражае вышэйшая мера пакарання — пажыццёвае зняволенне або смяротная кара. На знак пратэсту супраць пазапраўнага арышту Мікалай Аўтуховічі летась больш за 90 дзён трымаў галадоўку ў следчым ізалятары, што моцна падарвала яго здароўе.



► ЮБІЛЕЙ

# БАЦЬКАЎШЧЫНА — ВЯЛІКІ КЛОПАТ БАРЫСА КІТА

Васіль ЯКАВЕНКА

**Сто гадоў таму ў Санкт-Пецярбургу ў сям'і Уладзіміра Кіты, служачага дэпартамента тэлеграфа і пошты, нарадзілася немаўля, якому ў метрычным пасведчанні запісалі — «Барыс», а прозвішча — «Китъ», з цвёрдым знакам у канцы замест літары «а». Тым самым нібы наканавалі яму адметную знакавую сутнасць, адмысловую «кітовую» ролю і значэнне ў грамадскім віры, у людскім атачэнні.**

Здольнае хлапчанё ўжо ў дзіцячым ніцым узросце адчула складанасць свету, у які прыйшло, яно зразумела, што ёсць несправядлівы падзел у грамадстве, зразумела, чым гэты падзел абарочваецца для збяднелага люду.

Суцішваецца Грамадзянская вайна. Голад. З Санкт-Пецярбурга бацькі вярнуліся ў Беларусь, у дзедаву хату ў Агародніках — вёску пад Карэлічамі. І ўжо тут пранікнёнай душой Барыс усвядоміў новы падзел люду — на паноў-палякаў і мужыкоў-беларусаў... Ён з бацькамі апынуўся ў ліку апошніх, і зноў — голад і ўціск разам з паняволеным карэнным насельніцтвам. Выключную ролю ў фарміраванні самасвядомасці хлопчыка аказвае вясковы настаўнік Сцяпан Рамановіч, ён, урэшце, і дапамагае Барысу спакваля выйсці ў людзі — падрыхтавацца да іспытаў і паступіць у Навагрудскую беларускую гімназію — яскравы і жывы асяродак беларушчыны. Ішлі 1920-я гады.

Трэба меркаваць, менавіта ў Навагрудку Барыс Кіт сфарміраваўся як свядомы, цэльны чалавек, носьбіт і праводца беларускасці. Зрэшты, шмат чаго для яго выспявання дадаў і Віленскі універсітэт, з ягоным прагрэсіўным і бойкім студэнцкім асяродкам.

Адметны момант. Яшчэ будучы студэнтам і далей — выкладчыкам матэматыкі ў Віленскай беларускай гімназіі, Кіт вельмі блізка сышоўся з вядомым у свеце вучоным, прафесарам матэматыкі Антоні Зыгмунтам, жыццё і дзейнасць якога потым спадобіцца яму раскрыць у доктарскай дысертацыі.

Вялікую мітрэнгу і неспакой для Кіта прынёс 1939-ы, калі гэтак званыя Усходнія крэсы былі вернуты ў Беларусь. З канца 1939 года беларуская Вільня па загаду Масквы адыходзіць пад Літву. Падзея моцна ўдарыла па Віленскай беларускай гімназіі, у якой Кіт працаваў на той час дырэктарам. Што рабіць? Не палічыўшыся з турботамі, ён перавёў, перавёз сваіх узрушаных і занепакоеных вучняў з Вільні ў Навагрудак, дзе аднавіў сваю беларускую гімназію, зачыненую было палякамі.

Але нядоўга бавіўся — неўзабаве гэткага дзейнага чалавека выцягнулі з Навагрудка ў Баранавічы, зрабілі яго акруговым інспектарам аддзела народнай адукацыі баранавіцкай акругі (вобласці). Асноўнымі намаганнямі Кіта было там адкрыццё новых беларускіх школ. Праца падабалася. Адначасова выкладаў матэматыку ў тагачасным Баранавіцкім педінстытуце.



Барыс Кіт у сваёй кватэры падчас сустрэчы з беларускімі журналістамі Генадзем Кеснерам і Кастусём Лашкевічам 22 сакавіка 2010 г. Франкуфурт-на-Майне

Акурат у тыя перадваенныя гады веснім рэхам на яго накацілася другое каханне. Першую каханку сваю — Рыву ён згубіў раней у Карэлічах. Яркая, адметная дзяўчына! Але карэліцкі кагал не мог дапусціць, каб гой узяў шлюб з яўрэйкай, і Рыву звезлі з Карэліч далей за ягоныя вочы.

На гэты раз завалодала сэрцам Барыса Ніна Корсак, асоба з адметнай і слаўнай беларускай сям'і з Лебедзева, што пад Маладзечнам. Ён вучыўся разам з Нінай у Вільні. У сям'і Корсакаў шанавалі беларускія народныя традыцыі, песні. Цесць Іван Корсак адмыслова спяваў і быў старастам царкоўнага хору-капэлы. Кіт любіў, музыку, іграў, між іншым, на скрыпцы. Сышліся з цесцем...

Пройдзе час, і, калі ўжо пачнецца крывавы закалот паміж фашысцкай Германіяй і СССР, Ніна народзіць Барысу першага сына, Уладзіміра. А ў Барыса ж не толькі хатнія справы. У Барыса ў галаве школа. Адсутнасць школы аслабіць народ, змарнее духоўны патэнцыял.

Барыс Кіт, спачатку тоячыся, як што быў савецкім служачым, ціха настаўнічаў у вёсцы Лебедзева, на радзіме любай жонкі, а потым, як памяняліся трохі абставіны, узначаліў Пастаўскую настаўніцкую семінарыю. Нечакана працу ў Паставах перапыняе нямецкая турма, дзе кожны дзень пагражалі расстрэлам. Схудалы, зняможаны, ён больш чым праз месяц выходзіць з турмы і, верны свайму наканаванню асветніка, адкрывае ў Маладзечна Адміністрацыйна-гандлёвую школу; праграма навучання якой была блізкая да інстытуцкай, чым Кіт нямала ганарыўся.

Пры сканчэнні вайны ў Еўропе — ён у ліку перамешчаных асоб — у Германіі, потым у ЗША. Усё той жа просты, шчыры і дзейны беларус, ён фарміруе ў эміграцыі дыяспару, яе жыццё. Пачаўшы сваю працу з хімічнага кантролю ў фармацэўтычнай вытворчасці ЗША, яму собіць неўзабаве заняцца распрацоўкай хімічна-матэматычных формул вадароднага паліва ў галіне аэранаўтыкі і дабіцца бліскучага поспеху. У сааўтарстве з Эверэдам Дугласам выпусцілі кнігу па касмічнаму паліву. І памятная капсула з іменем Барыса Кіта знаходзіцца ў сцяне Капітолія.

Лукашэнка можа дазволіць «Газпраму» атрымаць кантроль над «Белтрансгазам», аднак за гэта будзе патрабаваць прэферэнцый у нафтавых пастаўках, мяркуюць эксперты. Расійскі газ для Беларусі не такі важны, як нафта. Менавіта нафта з’яўляецца акумулюючым элементам беларускага бюджэту, паколькі эканоміка Беларусі ў значнай ступені залежыць ад нафтаперапрацоўкі. Асноўнай праблемай для Беларусі з’яўляюцца расійскія экспартныя мыты на нафту, на якіх яна губляе каля 2 мільярдаў долараў. Апошнюю эскападу Беларусі — іск у Эканамічны суд СНД адносна пошлінаў на нафтапрадукты — эксперты звязваюць менавіта з тым, што беларускі бок у першую чаргу жадае дасягнуць адмены мытных збораў менавіта на нафту.

**«Deuthce Welle» (Германія)**

Для Кітая практыка даваць грошы дзяржавам, якія ўваходзілі ў склад СССР, не новая. У чэрвені 2009 года КНР дала крэдыт Малдове — той жа 1 мільярд долараў. А вось для Лукашэнкі такія «знакі ўвагі» цяпер сапраўды вельмі важныя. Усяго за адзін тыдзень Лукашэнка паспеў пабываць у Венесуэле, дзе дамовіўся пра пастаўкі нафты ў сваю краіну, а таксама наладзіў продаж сваіх вялікагрузных аўтамабіляў у Бразіліі, дзе дамовіўся пра плённае супрацоўніцтва ў будучыні. Лукашэнка цяпер актыўна шукае новых багатых сяброў. Раней, калі грошы ў вялікай колькасці даваў Крэмль, такой вострай патрэбы ў гэтым не было. А зараз, калі памер падарункаў з Расіі становіцца меншым, хоць і па-ранейшаму застаецца вельмі вялікім, узнікае неабходнасць сябраваць «на боку».

**«Финанс» (Расія)**

Расійскія мыты на ўвазныя іншамаркі гарантавана пахаваюць Мытны саюз з Беларуссю, а гэты самы Саюз прасоўвае асабіста Уладзімір Пуцін. Справа ў тым, што цяпер жыхары гэтай рэспублікі маюць магчымасць купіць машыну ў Германіі ці Бельгіі і папросту завезці яе ў краіну, выплаціўшы смешныя зборы. У нас жа пры перасячэнні мяжы аўтамабіль даражэе прыкладна на трэць. Зразумела, што Аляксандр Лукашэнка не пагодзіцца добраахвотна падкласці такую свінню мільёнам сваіх выбаршчыкаў за год да прэзідэнцкіх выбараў. І можна сабе ўявіць, наколькі беларускіх аўтааматараў будуць раздражняць наступствы «сяброўства з Расіяй», калі за яго давядзецца заплаціць з уласнай кішэні.

**«Версия» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КУБА. ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ АХВЯР РАБСТВА

Незвычайным спосабам адсвяткавалі на Кубе дзень памяці ахвяр рабства 26 сакавіка. У Гавану запрасілі з ЗША копію карабля «Amistad», які быў пабудаваны менавіта ў кубінскай сталіцы. «Amistad» праславіўся на ўвесь свет дзякуючы бунту 53-х нявольнікаў на сваім борце ў 1839 годзе. Іх везлі на Кубу, якая на той час была калоніяй Іспаніі, з Афрыкі. Нявольнікі захапілі судна і доўга плавалі па Атлантычнаму акіяну, пакуль нарэшце не прыплылі ў ЗША. Візіт «Amistad» на Кубу прайшоў на самым высокім узроўні. Карабель сустракалі намеснік міністра замежных спраў і спікер нацыянальнага парламента. Па словах аднаго з сустракаючых, дзякуючы перыяду рабства, у Кубы і Злучаных Штатаў ёсць агульная гісторыя.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### УКРАІНА. ПРАГУЛЬШЧЫКІ СУПРАЦЬ ЯНУКОВІЧА

Улепшых традыцыях савецкай прапаганды, прэса, блізкая да Партыі рэгіёнаў, якая знаходзіцца пры ўладзе ва Украіне, трактуе пратэсты львоўскіх студэнтаў. Студэнты правялі акцыі пратэсту супраць прызначэння міністрам адукацыі Дзмітрыя Табачніка. Апошні неаднаразова выступаў за наданне рускай мове статусу дзяржаўнай. Штодня студэнты ствaралі вялікі жывы ланцуг ад вакзалу да Політэхнічнага інстытута ў цэнтры горада. Між тым, прэса, якая фінансуецца Партыяй рэгіёнаў, лічыць, што «антытабачная кампанія» ў Львове — змова прагульшчыкаў, якім нецікава вучыцца. «Тым больш надвор'е спрыяе, сапраўдная вясна, так і хочацца вырвацца хутчэй з універсітэцкіх аўдыторый на вуліцу», — дадае адно з выданняў. Відавочна, што пакуль адміністрацыя Януковіча не ведае, як рэагаваць на падзеі ў Львове, і прыдумвае розныя байкі пра прагульшчыкаў.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. ЯРУЗЭЛЬСКАГА ЗАПРАСІЛІ НА ПАРАД ПЕРАМОГІ



Разам з Лехам Качыньскім, цяперашнім прэзідэнтам Польшчы, на парад перамогі 9 мая ў Маскве арганізатары запрасілі Войцеха Ярузэльскага. Генерал Ярузэльскі — ініцыятар увядзення вайсковага рэжыму ў Польшчы ў 1981 годзе. Фігура Ярузэльскага вельмі супярэчлівая. Частка грамадства лічыць, што ён выратаваў краіну ад грамадзянскай вайны. Іншыя палякі не могуць прабачыць яму ўсталявання дыктатуры. Гісторыя нейкім чынам паўтараецца. Пяць гадоў таму Качыньскі таксама быў запрошаны на парад, аднак у кампаніі з Аляксандрам Квасьнеўскім. Масква тлумачыць выбар Ярузэльскага тым фактам, што ён асабіста браў удзел у падзеях другой сусветнай вайны. З той жа нагоды ў Маскву запрасілі яшчэ дзевяць ветэранаў — былых кіраўнікоў розных краін. Самыя вядомыя ў гэтым спісе — Джордж Буш-старэйшы і Валеры Жыскар д'Эстэн.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### УЗБЕКІСТАН. МЕДЫКАМ АБМЕЖАВАЛІ ПРАВА НА ВЫЕЗД

Пастановай узбекскага Мінздраву ўводзіцца асаблівы рэжым выезду медыкаў за мяжу. Цяпер медыцынскія супрацоўнікі абавязаны мінімум за дзесяць дзён да ад'езду падаць на імя міністра аховы здароўя адпаведную заяву з указаннем мэты паездкі і дачакацца дазволу. Па вяртанні з паездкі яны мусяць напісаць абавязковую справаздачу пра свае замежныя прыгоды і на працягу трох дзён накіраваць яе ў адмысловы дэпартамент таго ж Мінздрава. Пастанова Мінздраву парушае артыкул 28 Канстытуцыі Узбекістана, паводле якога «грамадзянін рэспублікі мае права на вольны выезд». Зрэшты, і без таго грамадзяне Узбекістана не зусім свабодныя ў сваім жаданні выязджаць за мяжу. Спачатку патрэбна атрымаць сваёго роду выязную візу — г. зв. стыкер, які дзейнічае ўсяго два гады. Для атрымання стыкера патрэбна шмат даведак, часу і грошай.

**Па матэрыялах Фергана.ру (Узбекістан)**

### ГЕРМАНІЯ. САМЫ ВЯЛІКІ МІФ НЕАНАЦЫСТАЎ

Нямецкія гісторыкі нанеслі ўдар па аднаму з самых вялікіх міфаў руху неанацыстаў. Маюцца на ўвазе наступствы бамбардзіроўкі Дрэздэна 13–14 лютага 1945 года самалётамі брытанскай авіяцыі. У выніку таго налёту, як сцвярджалі нацысты, загінула 250 тысяч чалавек. Дрэздэнская трагедыя ў вачах правых радыкалаў кампенсуе злачынствы гітлераўцаў падчас вайны. Кожны год 14-га лютага ў сталіцы Саксоніі праходзіць буйны нацысцкі марш памяці ахвяр саюзнікаў. Аднак на самай справе, як сцвярджае група гісторыкаў пад кіраўніцтвам Рольфа-Дзітэра Мюлера, ад бомбаў брытанцаў загінула самае большае 25 тысяч чалавек. Даследаванне было замоўлена ўладамі Дрэздэна. На пошукі праўды вучоным выдалі сто тысяч еўра. Цяпер на падставе дадзеных гісторыкаў улады могуць распачынаць судовыя справы супраць правых радыкалаў, якія, спасылаючыся на вялікую колькасць ахвяр, зарабляюць сабе палітычны капітал. Праўда, нацысты таксама могуць аспрэчыць высновы гісторыкаў. Напрыклад, па афіцыйнай версіі ўладаў ГДР, у лютым 1945-га ў Дрэздэне было забіта 35 тысяч чалавек.

**Па матэрыялах «Junge Welt» (Германія)**

---

ЦІКАВА

# МАГНІТ ДЛЯ ТЭРАРЫСТАЎ

*Алег ПЯТРОЎ*

**Іспанскі ўрад і прэса сцвярджаюць, што ў Венесуэле пад патранажам мясцовых уладаў актыўна дзейнічае цэнтр баскскай тэрарыстычнай групоўкі ЕТА.**

Увогуле, Лацінская Амерыка заўсёды знаходзілася ў зоне асаблівай увагі дэпартамента іспанскіх спецслужбаў, якія змагаюцца з баскскім палітычным тэрарызмам. У часы каланізацыі Іспаніяй Новага свету сюды з'ехала шмат баскаў. Так, лічыцца, што ў Чылі кожны другі грамадзянін мае баскскія карані. Другая моцная хваля эміграцыі прыйшлася на часы дыктатуры Франка, калі ў Іспаніі нават баскская мова была пад забаронай.

У Лацінскай Амерыцы баскі не забыліся на гістарычную радзіму. Амаль у кожнай краіне рэгіёну існуе баскская грамада, культурныя цэнтры, музеі, выданні і г.д. Сярод эмігрантаў ёсць і тыя, хто сімпатызуе ЕТА. Прыхільнікі ЕТА збіраюць для тэрарыстаў сродкі, дапамагаюць легалізавацца ў выпадку эміграцыі або, наадварот, «легчы на дно», калі тых шукаюць у Іспаніі.

Найбольш актыўна цэнтры, блізкія да ЕТА, дзейнічаюць у лацінаамерыканскіх краінах, дзе пануюць левыя рэжымы, якія часам нават дапамагалі тэрарыстам. Такая практыка была выкліканая тым, што ЕТА ў 1960–1970-я гады актыўна змагалася з дыктатурай Франка. Не дзіўна, што ў 1970–1980-я ў ЕТА існавала свая моцная база на Кубе. Пазней, калі рухнуў СССР, а Кастра пазбавіўся савецкай падтрымкі, эмігранцкія цэнтры ЕТА перакачавалі ў Мексіку. Цяпер у тэрарыстаў, калі верыць іспанскім выданням, новая база — у Венесуэле.

Упершыню пра магчымыя кантакты венесуэльскіх уладаў і тэрарыстаў з баскскай групоўкі пачалі казаць у 2008 годзе. У той час калумбійскія спецслужбы заявілі, што ў лагерах калумбійскай групоўкі FARC, якая вядзе партызанскую вайну супраць афіцыйнага ўраду, з'явіліся загадкавыя людзі з Еўропы. Яны вучылі калумбійскіх інсургентаў, як падкладаць бомбы. Пазней калумбійскім спецслужбам стала вядома, што інструктары прыехалі з Краіны Баскаў. Усе яны былі актывістамі арганізацыі ЕТА.

З'яўленне ў Калумбіі этарас (так у Іспаніі называюць баевікоў ЕТА) дало першыя падставы падазраваць наяўнасць кантактаў паміж тэрарыстамі і венесуэльскімі ўладамі. Заняткі для партызан праходзілі на шасці базах FARC, якія знаходзяцца на тэрыторыі Венесуэлы. Пазней у прэсу патрапілі фрагменты пратаколу допыту аднаго з партызан, якога калумбійскія спецслужбы ўзялі




ў палон. Ён быў на курсах, якія праводзілі баскі. Па яго словах, настаўнікаў суправаджала асоба ва ўніформе афіцэра DISIP (венесуэльскі аналаг нашага КДБ).

У тым жа 2008 годзе ў рукі калумбійскіх вайскоўцаў трапіў лэптоп Рауля Рэйеса, аднаго з кіраўнікоў FARC, забітага калумбійскім спецназам. У файлах Рауля сустракаецца імя Артура Кубільяса. Іспанскай разведцы гэта імя было добра вядома. Кубільяс — сябра ЕТА, які ўжо прыкладна дзесяць гадоў жыве ў Венесуэле.

Кубільяс — уладальнік рэстарана ў Каракасе і нефармальны лідэр мясцовай камуны баскаў. Сярод баскаў, як піша прэса, ёсць і сябры ЕТА. У Венесуэле іх прыкладна 60. Аднак гэта тыя, хто жыве адкрыта. Тыя ж, на каго ў Іспаніі заведзеныя крымінальныя справы, жывуць у падполлі, каб не быць высланымі на радзіму.

У Кубільяса і яго сяброў вельмі цесныя кантакты з чыноўнікамі з Міністэрства сельскай гаспадаркі, кіраўніцтвам нацыянальнай гвардыі, ваеннай разведкі. Адзін з яго сяброў уваходзіць у кіраўніцтва Coordinadora Simon Bolivar (адна з самых праўрадавых арганізацый у краіне). Баскі таксама прысутнічаюць у кіраўніцтве Аб'днанай сацыялістычнай партыі Венесуэлы, якую стварыў сам Уга Чавес.

Усё гэта, а таксама той факт, што адзін з лідэраў ЕТА быў нядаўна арыштаваны ў Лісабоне падчас спробы з'ехаць у Каракас, дае іспанскім журналістам падставы называць Венесуэлу «магнітам для тэрарыстаў».

Іспанская прэса нават падазрае, што менавіта ў Венесуэле знаходзіцца выканаўчая група ЕТА, якая непасрэдна адказвае за арганізацыю тэрарыстычных актаў і забойствы. З 1999 года (тады Чавес прыйшоў да ўлады) Венесуэла не выдала Іспаніі ніводнага тэрарыста ЕТА. Больш таго, некаторыя з іх пасля афіцыйнага запыту Мадрыда нечакана знікалі. Цалкам магчыма, што іх проста легалізавалі пад іншымі прозвішчамі.

Не так даўно Мадрыд афіцыйна патрабаваў ад Каракаса прыпыніць падтрымку тэрарыстаў. У сваю чаргу, афіцыйны Каракас пачаў інфармацыйную кампанію супраць Іспаніі, назваўшы ўсе абвінавачанні з яе боку «палітычнай маніпуляцыяй».

Узнікае пытанне — нашто Чавесу трымаць у сябе тэрарыстаў ЕТА? Нагадаем, што этарас нясуць адказнасць за забойства каля тысячы чалавек. Яны фігуруюць у спісах тэрарыстычных арганізацый шматлікіх краін.

Тут можа быць шмат матываў, напрыклад, ідэйная блізкасць. ЕТА адносіць сябе да лагеру сацыялістаў. Аднак не выключана, што кантактуючы з ЕТА, Чавес папросту хоча насаліць Мадрыду. Вядома, што ён лічыць асабістым ворагам іспанскага караля Хуана Карласа, які на адной з публічных сустрэч патрабаваў ад лідэра балiварскай рэвалюцыі «заткнуцца». Каракас таксама сцвярджае, што іспанскі ўрад быў нейкім чынам звязаны з венесуэльскімі палітыкамі, якія спрабавалі ў 2006 годзе арганізаваць дзяржаўны пераварот.

У любым выпадку, скандал наконт магчымых кантактаў Чавеса і ЕТА толькі пачынаецца і, відавочна, кіне цень не толькі на Чавеса, аднак і на яго саюзнікаў.

**Па матэрыялах іспанскай прэсы**



ЭКАЛОГІЯ

# МЭРСЭДЭС ПАД НАЗВАЙ АЭС

**31 сакавіка ў Ківе прайшлі грамадскія слуханні па праекту беларускай АЭС. У іх браў удзел і журналіст «НЧ» Алег Новікаў.**



Да гэтых слуханняў Мінск падрыхтаваўся сур'ёзна. Нават надрукавалі спецыяльныя праспекты, разлічаныя, сыходзячы з іх тэкстаў, менавіта на ўкраінскага чытача. Праспекты ўручалі пры ўваходзе ў залу, што знаходзілася на восьмым паверсе Міністэрства аховы прыроды, дзе і адбывалася мерапрыемства. Дарэчы, сам будынак міністэрства пафарбаваны ў зялёныя колер. Колер сцен, праўда, адзінае, што адрознівае ўстанову ад саўковай канторы (пасля абеду тут нават адключылі ліфт).

У незвычайнай актыўнасці напярэдадні 31 сакавіка нашых уладаў не было нічога дзіўнага. Слуханні ў Кіеве мелі важны характар як для аматараў мірнага атаму, так і для яго праціўнікаў. Апошнія таксама падцягнулі на берагі Дняпра свае лепшыя кадравыя рэсурсы.

Фактычна ўпершыню ў гісторыі станаўлення беларускай атамнай энергетыкі павінна было адбыцца нешта падобнае на сапраўдныя дэбаты. На радзіме БелАЭС слуханні нагадвалі хутчэй дрэнны спектакль. Не вядома, на каго, быў разлічаны адзін з тэкстаў таго самага праспекту пра тое, што 80 грамадскіх арганізацый і працоўных калектываў ухвалілі будаўніцтва АЭС у выніку дыскусіі ў Астраўцы ў кастрычніку мінулага года. Кожнаму, хто цікавіцца экалагічнай тэматыкай, вядома пра тое, што на самай справе адбывалася ў Астраўцы. Асабліва пра затрыманне расійскага эколага Ажароўскага, які праседзеў за кратамі сем сутак. Дарэчы, ён зараз кажа, што там нядрэнна вывучыў беларускую мову.

Пасля Астраўца былі слуханні ў Літве і Латвіі. Лічыць іх слуханнямі таксама цяжка. Гэта былі своеасаблівыя рэкламныя шоу беларускіх атамшчыкаў. Спробы ўступіць у любую дыскусію выклікалі паўсюдна адмоўную рэакцыю. У Рызе пасланцы Лукашэнкі ўвогуле спыніліся прамаўляць пасля таго, як пабачылі, што на слуханнях з'явіліся сябры беларускай антыядзернай кааліцыі (іх, дарэчы, прыняў латвійскі міністр экалогіі).

У Кіеве балтыйскі нумар прайсці не мог. Чарнобыльская салідарнасць прымусіла мясцовых эколагаў уважліва адсочваць наш атамны праект з самага пачатку. Акрамя таго, той факт, што краіна — ахвяра чарнобыльскай катастрофы выршыла будаваць АЭС, дае ўкраінскаму атамнаму лобі козыр на развіццё сектару. Праз два гады ў некалькіх украінскіх АЭС заканчваецца тэрмін карыстання, і прыхільнікі атамнай энергетыкі шукаюць любыя падставы, каб працягнуць іх эксплуатацыю.

У выніку яшчэ за тыдзень да пачатку слуханні былі анансаваныя на ўсіх украінскіх больш-менш паважных экалагічных сайтах. У залі ў Мінпрыродзе, дзе сабралася каля ста чалавек, можна было пабачыць актыў украінскіх экалагічных грамадскіх арганізацый.

Спачатку слова атрымала беларуская афіцыйная дэлегацыя. Першае ўражанне ад выступаў Андрэя Рыкава (дырэктар Белэнергапрама), Якава Кёнінгсбрга (прадстаўнік Мінздраву) і Віктара Аверына (дырэктар Інстытута радыялогіі) — здзіўленне. Усе трое вельмі добра валодаюць тэмай і, калі б у Беларусі сапраўды адбываліся вольныя дэбаты па АЭС, яны б маглі годна прэзентаваць і абараняць праект.

Галоўныя тэзісы абаронцаў БелАЭС: краіна абсалютна энергетычна залежная (толькі 17 працэнтаў патрэбнай энергіі вырабляецца ў Беларусі), разлікі паказалі, што вецер, вада і сонца не могуць быць альтэрнатывай атаму, мадэль рэактару, якая будзе ўсталяваная на Астравецкай станцыі, — абсалютна бяспечная. А нават калі і бабахне, усё абмяжуецца радыусам у тры кіламетры.

Асобна згадалі, што тып рэактару на беларускай АЭС будзе абсалютна новы, які не мае практычных выпрабаванняў. Але, па словах Рыкава, тое не праблема, таму што гэта не новы рэактар, а мадэрнізаваны стары. «Нешта падобнае адбываецца на аўтамабільным рынку. Быў «Мэрсэдэс 500» — стаў «Мэрсэдэс 600», — сказаў Рыкаў. Такое параўнанне аўдыторыі вельмі спадабалася. Пазней выступоўцы часта і ахвотна згадвалі, што для беларускіх кіраўнікоў АЭС — гэта як «Мэрсэдэс».

Пасля лабістаў АЭС слова ўзялі апаненты. Яны вельмі лёгка знайшлі супярэчнасці ў прамовах папярэдніх аратараў. Мадэль рэактару для беларускай АЭС прынцыпова новая. Яе магутнасць на 20 працэнтаў большая, ключавыя элементы таксама. У Фінляндыі стваральнікі АЭС прызнаюць, што патэнцыйны арэал радыяцыйнага забруджвання ў выпадку аварыі на станцыі — 1000 кіламетраў, а ў Астравецкай той жа арэал чамусьці толькі тры кіламетры. І нават тыя, хто сімпатызуе будаўніцтву АЭС, пагаджаюцца, што захоўваць ядзернае смецце пэўны час давядзецца ў Беларусі. І калі шукаць лепшае месца для ягонага складзіравання, гэта, натуральна, Чарнобыльская зона, якая зараз не выкарыстоўваецца. А гэта фактычна мяжа з Украінай.

Беларуская дэлегацыя рэагавала на крытыку цікава: пару чалавек папросту выйшлі на перакур.

Прэзідыум слуханняў, які ўзначальваў намеснік міністра аховы прыроды, прапанаваў абмеркаваць фінальную рэзалюцыю праз інтэрнэт. Відавочна, новы ўкраінскі Кабмін папросту не хоча сварыцца з Лукашэнкам, бо большасць прысутных на слуханнях былі яўна супраць будаўніцтва БелАЭС.

На гэтым слуханні і закончыліся.

Цікавае ўражанне пакінулі нашы чыноўнікі. Напрыканцы ім так спадабалася дыскутаваць, што адзін з іх палез да мікрафона, парушаючы рэгламент. Цудоўнае адлюстраванне адной са старонак чалавечай натуры, якой патрэбна праяўляць сваю годнасць у роўным дыялогу, а не праз дыктат.

І яшчэ. Слуханні ішлі на ўкраінскай мове. У пачатку нехта прапанаваў перайсці на рускую з-за павагі да беларускіх гасцей. Пачуўшы прапанову, дэлегаты ад Беларусі нават абурыліся: «Няўжо мы ўкраінскую мову не разумеем?!»

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДАНІЭЛЬ КОН-БЕНДЗІТ



Лідэр студэнцкай рэвалюцыі 1968 года (а цяпер адзін з правадыроў фракцыі Зялёных у Еўрапейскім парламенце) для чалавека, які пачынаў сваю кар'еру як звычайны анархіст, дабіўся вельмі многага. Летась французскія Зялёныя пад яго кіраўніцтвам узялі 15 працэнтаў на выбарах у Еўрапарламент. Два тыдні таму зялёныя пілі шампанскае з нагоды выдатных вынікаў на рэгіянальных выбарах — 17 працэнтаў. Такая тэндэнцыя дае шанец парушыць традыцыйную формулу выбараў, на якіх сацыялісты супрацьстаяць галістам. Аднак нечакана для ўсіх Даніэль заклікаў да роспуску партыі. У такім фармаце, на яго думку, Зялёныя не змогуць дабіцца рэальных змен у грамадстве, нават калі перамогуць у 2012-м. Замест партыі Кон-Бендзіт прапанаваў стварыць нейкі аморфны рух, які ён сам называе «палітычны кааператыў». Прапанова Кон-Бендзіта выклікала шок у шэрагах Зялёных. Шмат хто кажа, што вынікам рэалізацыі пражэктаў Даніэля стане знішчэнне ўсёй базы экалагічнага руху ў Францыі.

### ЛУКА ЗАЙА



Актывіст правай ксенафобскай партыі «Ліга Поўначы», якая выступае за стварэнне асобнай дзяржавы на базе шэрагу паўночных правінцый Італіі, стаў першым у гісторыі Італіі сябрам "Лігі Поўначы", які ўзначаліць цэлы рэгіён. У Венецыі на мінулым тыдні перамог кандыдат ад партыі сепаратыстаў. Прарыў "Лігі Поўначы" відавочна звязаны з крызісам даверу правага электарату да Сільвія Берлусконі, які доўгі час быў адназначным правадыром італьянскіх правых. Пасля таго, як «Кавалер» (мянушка Берлусконі) стаў героем шэрагу сексуальных скандалаў, давер да яго і ягонай партыі значна ўпаў. Зайа, які нарадзіўся ў 1968 годзе, дарэчы, вядомы ўсёй Італіі дзякуючы інцыдэнту, які меў месца ў 2008 годзе. Ён выпадкова стаў сведкам таго, як машына, за рулём якой сядзеў албанец, была раптам ахопленая полымем. Але Лука не стаў аказваць дапамогу, а паехаў далей. Па яго словах, так паступіў бы на ягоным месцы кожны сумленны грамадзянін Італіі.

### ДЗМІТРЫЙ ТАБАЧНІК



Прызначэнне Табачніка на пасаду міністра адукацыі выклікала сапраўдны шок. Увесь мінулы тыдзень рэгіён дэманстраваў сваё «фі» Дзмітрыю Уладзіміравічу. У Львове прайшла маніфестацыя за адстаўку Табачніка, якая сабрала пяць тысяч чалавек. Падобнае патрабаванне адстаўкі прыняла Львоўская Рада. Студэнты горада абвясцілі забастоўку. «Антытабачная» кампанія ўключае ў сябе і выкарыстанне помнікаў. На помніках вядомых асобаў можна пабачыць графіці «Прыбярыце Табачніка, або я пайду». Нацыянальна свядомыя ўкраінцы не могуць прабачыць Табачніку тое, што ён назваў украінскую мову мовай вузкай праслойкі. Табачнік быў кіраўніком адміністрацыі пры Кучме, што давала ўкраінцам нагоду жартаваць пра тое, што ў краіне пануе «ДЗІМАкратыя». Нарэшце, ён пракалоўся, калі ў 2004 годзе ад імя Януковіча падараваў дзяржаўнаму музею лісты Міхайла Грушэўскага (лідэра ўкраінскай рэвалюцыі 1917–1922 гадоў). Аказваецца, тыя лісты былі скрадзеныя ў аднаго калекцыянера. Сам Януковіч пакуль неяк не рэагуе на пратэсты, аднак факт прызначэння адыёзнага Табачніка на пасаду міністра сведчыць, па словах аналітыкаў, пра слабасць кадравай палітыкі Партыі рэгіёнаў.

ВІЛЕНСКАЯ ШКОЛА

# ПІЛІГРЫМКА МАСТАКА

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**Захавальніца фондаў графікі Мастацкага музея, вытрымаўшы паўзу-інтрыгу, дастала з тэчкі аркуш… «Вось вам ваш Горыд!» Моўчкі назіраю, як у сапраўднага майстра ўсё пераканаўча проста і выразна…**

## Кальварыя

Літаграфскі адбітак твора, што выкананы ў сярэдзіне 1930-х гадоў Язэпам Горыдам, мастаком буйнога і рознабаковага таленту, з імем якога знітаваны росквіт заходнебеларускага перыядычнага друку, уражвае. Някідкі і немудрагелісты сюжэт, увасоблены ў строгай, лаканічнай кампазіцыі, надзвычай сэнсава ёмісты, апрача майстэрства, палоніць праўдзівай і гранічна шчырай філасафічнасцю.

«Кальварыя» — не адзіная з вядомых станковых работ мастака, аднак мала кім бачаная на Беларусі, дый у цяперашняй Літве. Знаходзіцца яна воддаль людскіх вачэй і іх мітусліва-прагматычных клопатаў, у музейным сховішчы.

Па-над шатамі дрэваў, што пагаспадарску апанавалі могілкавы ўзгорак, стромка ляцяць у неба лёгкія ракальныя абрысы белага, двухвежавага касцёлу Знайдзення Святога Крыжа з выявай Збаўцы над ім. Паўсталы ў XVII стагоддзі і разбудаваны ў 1755–1772 гадах, будынак быў аддадзены пад апякунства айцам-дамініканам. Касцёл утварае кампазіцыйны цэнтр твора. Абапал — своеасаблівая рама з клеймамі — выявамі чатырнаццаці капліцаў-мураванак. Не знішчаныя за часамі другой сусветнай вайны, яны без дай прычыны былі ўзарваныя ў «хрушчоўскую адлігу» ў 1963 годзе. Пад 2000-ы год асобныя з іх узноўленыя. Капліцы — Стацыі, мясціны прыпынку, малітвы, роздуму на Крыжовым Шляху Бога і чалавека. (Кальварыя — ад лац. Calvariae locus «месца чэрапа», Галгофа (старагабр.) — пагорак, на якім укрыжавалі Збаўцу). Апошнія беларускія пілігрымкі па адной з даўжэйшых вуліц горада — Кальварыйскай — у міжваенныя часы ладзіліся дзякуючы ахвярнасці кс. Адама Станкевіча, яшчэ да яго высылкі ў Слонім.

Прыпынімся на асобных рэчах таленавітага творцы Язэпа Горыда, на вядомых нам імгненнях яго зямнога быцця.

## Досвітак

Шлях будучага мастака пачаўся, мяркуючы па вядомых дакументах, досыць шарагова для яго часу. Язэп Горыд прыйшоў на свет 15 ліпеня 1896 года ў Адэсе, у шматдзетнай сям'і. Гарадскую школу закончыў у Марыупалі, якраз на пярэдадні першай сусветнай вайны.

На Кубані Горыд, вольнапісаны царскага войска, далучыўся да брыгады Люцыяна Жэлігоўскага,



Язэп Горыд, студэнт

у складзе якой — праз Бесарабію і Галіцыю — тройчы паранены стралец Язэп дайшоў да Вільні. Дакладна не вядома, удзельнічаў ён ці не ў бунце мяцежнага генерала супраць польскага камандавання ў 1921 годзе, у выніку якога на канфедэратках жаўнераў з'явіўся гістарычны знак — «Пагоня».

Пэўна, наблукаўшыся па Вільні ў пошуках працы, напрыканцы кастрычніка 1923 года Язэп Горыд падаў прашэнне на мастацкі факультэт ВУСБ. Разам з дакументамі (аўтабіяграфіяй, трыма фотакарткамі) адзначаны і творчыя працы для прагляду камісіі. Сын Браніславы Янкоўскай, рыма-каталік, былы ваяр Язэп Горыд прыйшоў вучыцца, маючы жыццёвы гарт і неблагую першапачатковую мастацкую падрыхтоўку. Пра гэта гавораць ягоныя першыя з вядомых работ — алейныя краявіды 1924–1925 гадоў — «Нёман з рыбакамі на беразе» ды «Узгорак», што зараз зберагаюцца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве.

З першых курсаў неаднаразова быў адзначаны на справаздачных выставах факультэта ў майстэрнях партрэтнага і дэкарацыйнага жывапісу. Пра ягоную «раннюю мастацкую сталасць» сведчыць і партрэт трохі старэйшага прыяцеля, мастака Рафала Яўхімовіча.

## Партрэт дойліда

Партрэт вядомага ў Вільні скульптара і архітэктара Рафала Яўхімовіча (1893–1961), якога можна лічыць аўтарам першага віленскага перформанса, захоўваецца ў Мастацкім музеі Літоўскай Рэспублікі. Рафал пасля навучэння ў школе Монтвіда (1913–1915) з 1919 па 1926 вучыўся ў ВУСБ. Стажыраваўся ў Кракаўскай акадэміі мастацтваў, вучыўся ў Парыжы. Аўтар праекта Стацыя (Дарога на Кальварыю), праектаў помнікаў для Вільні: Уладзіслава Сыракомлі, Адама Міцкевіча, Вітаўта Вялікага.

Партрэт Рафала Яўхімовіча захапляе і бянтэжыць адначасова. На тле зменлівага неба, якое займае ледзьве не ўсю плошчу палатна, перакрываючы сабою ўмоўна азначаную пяшчотную зяленіну рэльефу, амаль за ўвесь рост пададзены герой. У лёгкаартыстычным развароце тулава, з раптоўна, але не пафасна павернутай галавой, ён успрымаецца досыць натуральна.

Элегантны малады чалавек, што ўсвядоміў сябе творцам, пададзены ў стане годна-засяроджанага спакою. У не надта дынамічнай кампазіцыі чуецца стрыманая ўнутраная энергія. Стыхія душы мастака прыцішаецца выхаванаінтэлігентнай паставай мадэлі, ураўнаважваецца спакойным, пранізліва-пільным позіркам вялікіх шэра-блакітных вачэй, пачуццёвымі юнацкімі вуснамі.

Правая рука героя, што натуральна ахапіла калена — сэнсавы акцэнт твора. Сваёй напрацаванасцю яна выдае ў ім моц каменячоса, волата, у той жа час доўгім і пластычным пальцам героя мог бы пазайздросціць і музыкантвіртуоз. Заваражвае і гармонія ласкава-далікатных фарбаў, якія сведчаць пра адзінства героя з наваколлем. Мройліва-досвіткавая нюансіроўка пяшчотных фарбаў узмацняе агульны рамантыкасімвалічны акорд твора.

Вобраз вытанчанага інтэлігента, думнага і мэтанакіраванага творцы, які ўнутрана саспеў, каб неўзабаве рушыць да запаветнага Парыжу, стварыў малады Горыд у 1926 годзе. А «агрэхі» на паверку з'яўляюцца прадуманым і ўдала скарыстаным мастацкім сродкам. Рэалістычныя суадносіны рознамаштабных дэталяў і вобразаў неўзабаве ўвогуле стануць уласцівым мастаку прыёмам. Аднак у палітычнай графіцы.

## Асяродак

На зямлі дзядоў, Віленшчыне, і ў самім горадзе «рэпатрыянт-вяртанец» Горыд меў кола знаёмых, сярод якіх было шмат беларусаў розных прафесій і канфесій. Упэўніцца ў гэтым няцяжка. Варта азірнуцца на яго шлях у кніжнай графіцы.

У 1925 годзе ён аздобіў выданне фальклярыста і музыказнаўцы Антона Грыневіча «Беларускі дзіцячы спеўнік». У снежні 1926 года распрацаваў лагатып Грамадоўскай газеты «Narodny zwon», надаў лаканічны і жывы твар песеннаму зборніку Рыгора Шырмы, праілюстраваў зборнік чарадзейных казак, укладзены Янкам Станкевічам, аздобіў другое выданне «Вянка» Максіма Багдановіча і зрабіў яшчэ шмат іншага.

Кантактаваў Горыд і з такімі яркімі асобамі, чые прозвішчы не патрабуюць ніякіх каментараў: Ігнатам Дварчаніным, Сымонам Рак-Міхайлоўскім, Язэпам Драздовічам, Міколам Васілеўскім, Васілём Сідаровічам. Першы біёграф і даследчык творчасці Горыда Арсен Ліс сцвярджае, што Сымон Рак-Міхайлоўскі, тады дэпутат Польскага Сойму, замовіў перспектыўнаму мастаку партрэты Якуба Коласа і Янкі Купалы. Лёс гэтых партрэтаў не вядомы, але ў Мінскім музеі Купалы (як і шмат дзе па Літве і Беларусі) захоўваецца графічны адбітак партрэта песняра аўтарства Ніны Сасноўскай і Язэпа Горыда. Спадарыня Ніна зрабіла алоўкавы малюнак, а малады і гожы Язэп перавёў яго на літаграфскі камень.

Не настойваем, што ў палон «беларушчыны» і пошукі сацыяльнай праўды юнак трапіў не без спрыяння рамантычных студэнтак факультэта выяўленчага мастацтва ВУСБ, але і не абвяргаем. Хоць, зразумела, былі для гэтага важкія ўнутраныя прычыны.

## Зорны час

Спрадвеку смех спадарожнічае жыццю чалавека і народа ўвогуле. Беларусы тут не выключэнне: слоўнік эпітэтаў фіксуе 121 вызначэнне смеху, у той час як вызначэнняў слоў «плач», «слёзы» — амаль у два разы меней. Мо і не паказчык, але… Нягледзячы на тое, што смехавыя традыцыі трывалі яшчэ з часоў паганскай абраднасці, перадаваліся вуснапаэтычнай традыцыяй, жылі ў народным тэатры, знаходзілі ўвасабленне ў пазнейшых творчых праявах душы, беларусаў наўрад ці назавеш нацыяй вясёла-смяшлівай. Не было ні шматтысячных карнавалаў, ні якой іншай агульнанароднай праявы весялосці.



Язэп Горыд. Партрэт скульптара Рафала Яўхімовіча

# ЯЗЭПА ГОРЫДА

Не спрыялі гэтаму ні зоры, ні гісторыя.

На Гецьманскую № 4, у рэдакцыю часопіса «Маланка», студэнт Горыд, няблага знаны беларускай грамадой, прыйшоў увосень 1926 года. Прыйшоў у сатырычны часопіс не таму, што быў ад прыроды «жартуном» па жыцці, гэткім «запісным веселуном». Высілкаў Горыда, разгортвання яго таленту на ніве Беларускага Адраджэння вымагаў сам час. У рэпрэсіўных варунках Заходняй Беларусі смех заставаўся бадай адзіным легальным і дзейсным сродкам абароны годнасці ды пашырэння ідэяў змагання.

Горыд востра бачыў і балюча перажываў хібы сацыяльна-грамадскай рэчаіснасці, і таму быў не толькі ілюстратарам, але і аўтарам актуальных тэмаў часопіса. Хтось заўважыў, што саборныя роспісы — эмацыйная «біблія для тых, што не ўмеюць чытаць», дык перафразуючы гэта можна сказаць, што энергічныя і прафесійныя, сацыяльна і псіхалагічна трапныя вобразы Горыда сталіся калі не універсітэтам, то сапраўднай асветна-палітычнай школай для значнай часткі народа.

Ідэйна-мастацкі даробак яго на гэтай ніве досыць поўна і рупліва праанаалізаваў беларусіст А. Ліс у эцюдзе да партрэта мастака «Пякучай маланкі след», які ўжо стаў бібліяграфічным рарытэтам.



Язэп Горыд. Аб'ёмны роспіс каляровымі тынкоўкамі (сграфіта). Будынак на вул. Дамініканская. Захаваўся да гэтага час

## Непагадзь

Усё мацней ад вясны 1928 года падціскалі грамадска-палітычныя зазімкі. Чарадой ішлі палітычныя суды... Подых сцюжы для беларускага (ды і для польскага) дэмакратычных рухаў даводзіў да здранцвення.

Горыд (свядома ці не) працягвае традыцыю сатырычнага рэалізму, запачаткаванага яшчэ Карусём Каганцом. Мастацкая публіцыстыка — адна з палітычных прыладаў будоўлі нацыі — не давала мастаку поўнага творчага задавалення. Дый беларускія выданні, якія ледзь трымаліся на плыву, не забяспечвалі элементарнага заробку, як кажуць, «на падтрыманне штаноў». Так склалася, што жнівеньскі нумар «Маланкі» за 1928 год быў апошнім для Горыда.

Пасля «Маланкі» мы амаль зусім развучыліся смяяцца — заначыў у сваім дзённіку Максім Танк, які вельмі цаніў мастацкі талент Горыда.

## Спакуса

У чэрвені 1928 года Язэпу Горыду прапанавалі паўдзельнічаць у выставе, што мусіла адбыцца ў памяшканні рэстарацыі Урублеўскіх (на рагу Міцкевіча і Арэшкоўскага). Быццам бы нічога надзвычайнага для сябры WTAP — узяць удзел у справаздачнай імпрэзе суполкі. Але, апрача асноўных, не абы-якіх удзельнікаў: Гапэн, Ямант, Карней, Кулеша, Германовіч, Яўхімовіч і інш. — даслаў у склад выставы тры жывапісных абразы Людамір Сляндзінскі. Відаць, быў усцешаны сваім статусам «адмыслова запрошанага» і Горыд.

Як і раней, у яго душы жыла Беларусь. Горыд, які ўжо не стала супрацоўнічаў з парэшткамі беларускіх выданняў (як бы ні касаваліся ў прафесійным асяродку на яго палітызаванасць ды схільнасць да беларускасці), калі дарма, калі за сімвалічную плату ахвяраваў на карысць ідэалаў юнацтва праменьчыкі таленту. Інакш і не вызначыш шчымліва-лірычную нізку лінарытаў-заставак, гэты Горыдаўскі краявід настрояў, станаў беларускай прыроды ў «Беларускім Календары» за 1928 год.

Атрымаўшы памяшканне пад часовую майстэрню ў бернардзінскіх мурах, Язэп Горыд выканаў сваю першую манументальную замову, што істотна падмацавала яго фінансавы стан. Падчас выканання гэтай працы ён паўдзельнічаў яшчэ ў 1929 годзе ў дзвюх выставах: у Вільні і Познані са сваімі станковымі творамі.

Але гэта быў толькі пачатак. Умацоўвалася вера, што ён будзе «першым сярод роўных». У 1928 годзе ён быў запрошаны паказаць свае творы ў парыжскай галерэі.

У кастрычніку таго ж года Горыд сваім трошкі фарсістым, з юнацтва адпрацаваным почыркам — імклівая каліграфія зграбных малых літараў з вытанчанымі завіткамі прапісных і карункамі вялікіх (загалоўных), піша прашэнне да пана дэкана Рушчыца, якое заканчваецца выразам: «Для майго ад'езду на далейшае навучэнне ў Парыж». Просьба ўчарашняга студэнта была задаволена.

## Да Парыжу

Дабрацца да магнетычна-прыцягальнай «штаб-кватэры еўрапейскага і сусветнага мастацтва» было і не складана, але і не проста. Скарыстоўваючы ўсе мажлівыя (і немажлівыя) нагоды і падставы, з усёй Еўропы імкнулася туды мастацкая моладзь. Хто дзяржаўным коштам, на якую стажыроўку, хто сваім, хто на грамадскія складкі. Ехалі «павучыцца» на час, а заставаліся на доўгія гады ці назаўжды. Сваекоштных, да якіх належаў і Горыд, ва ўсе часы была большасць.

Мара не аднаго пакалення творцаў, Луўр, ды іншыя музеі вабілі і спакушалі. Спакушалі традыцыямі ды размаітасцю палітраў творчых школаў, стыляў, найноўшымі мастацкімі павевамі, спакушалі разняволена-багемным жыццём і вольным паветрам.

Невядома, лёгка ці не было асвоіцца Горыду ў Парыжы, куды ён выправіўся пад канец 1929 года, стаць «не чужым» сярод мастакоў Манпарнасу, судакрануцца з колам заўсёднікаў — філосафаў «Ратонды».

Цягам амаль года (наведаў тады ён і Італію) спасцігаў Язэп іншае жыццё, набываў новыя веды і ўдасканальваў сваё майстэрства. Але, пэўна, гэтага «не чужога» мастака, так і не стаўшага для парыжскай багемы «сваім», калаўрот буйнога мегаполіса, раз-пораз падштурхоўваў да роздумаў. Паводле ненадрукаванага артыкула Мсціслава Дабужынскага «Даўно я не быў у Ратондзе» (1927) можна прыкладна рэканструяваць, пра што разважаў творца. «Грамадзянін свету», вядомы мастак Дабужынскі жыў там да 1929 года, выкладаў у Школе дэкаратыўнага мастацтва, нават меў уласную мастацкую студыю.

Але больш істотным за супадзенне «часу і месца» знаходжання ў Парыжы двух мастакоў — Горыда і Дабужынскага — бачыцца іх блізкасць ва светаўспрыманні, блізкасць іх жывапісна-пластычнай мовы. Яны абодва прагна шукалі ўнутранае нацыянальнае апірышча, у тым ліку і ў ліцвінстве (у шырокім трансцэндэнтным сэнсе).

Вытрымаўшы спакусу Парыжам і на развітанне паказаўшы плён сваёй творчасці ў знаёмай ужо Галерэі Зак у 1930 годзе, Язэп Горыд вяртаецца на радзіму.

## Цянёты жыцця. Вільня

Калі Горыд зноў ступіў на віленскі брук, яму было трохі за трыццаць. Язэп, «смелы, яркі, як стыхія», «прывёз з Парыжа манеру пісьма яшчэ больш свабодную, лёгкую, каларыт гранічна праяснены, звонкі», як згадваў Сергіевіч. Сустрэлі мастака прыветна.

З усёй апантанасцю Горыд кінуўся ў прафесійнае і выставачнае жыццё. Можна сказаць, «быў нарасхват». Як сябра WTAP, чатырнаццаццю працамі (жывапіс, графіка, акварэль) удзельнічаў у адкрытай 14 чэрвеня 1931 года выставе, прымеркаванай да запачаткавання музея сучаснага мастацтва. Разам з іншымі калегамі паказваў свае работы на I Выставе твораў віленскіх мастакоў у Друскеніках.

У тым жа 1931-м перайшоў у WTNASP, сябрамі якога былі Уладзіслаў Дунін-Марцінкевіч, Станіслаў Яроцкі, Чэслаў Веруш-Кавальскі, Чэслаў Знамяроўскі, Пётр Жынгель і інш. Суполка «незалежнікаў» у тыя часы была на ўздыме. Першую экспазіцыю «незалежнікі», сярод якіх быў Горыд, не перапыніўшы стасункаў з WTAP, адкрылі 20 верасня 1931 года ў Бернардзінскіх мурах. У кастрычніку таго ж года ў гарнізонным казіно была зладжана яго персанальная выстава. Сагравау творцу і розгалас, што ішоў пра яго ў Віленскім і Варшаўскім друку.

Зацурчэлі прэстыжныя і грашовыя заказы і іншыя спакуслівыя прапановы. Ад пачатку 1932 года, тры гады запар, яго выставы атрымлівалі рэзананс у Варшаве.

Горыд меў ужо досвед манументальных прац (разьба ў капліцы шпіталя Св. Якуба), калі атрымаў вялікую замову на выкананне вітражу і фрэскаў у прэзентацыйнай зале віленскага гарнізоннага казіно. Праца, якой аддаў год жыцця, рэалізавалася ў сімвалічныя сцэны Вызвалення і Адраджэння Польшчы і была ўспрынята замоўцамі патэтычна.

Напрыканцы кастрычніка 1932 года Язэп Горыд паказаў там жа «сваю творчую кухню» — персанальную выставу з 50-ці твораў. У экспазіцыю ўвайшлі эскізы фрэсак, вітражоў, графіка, асобныя станковыя рэчы выкананыя майстрам па адмысловай замове кіраўніцтва казіно. У 1932 годзе Язэп паўдзельнічаў сваімі працамі ў выставе WTAP. Наўздагон за ёй атрымаў замову на стварэнне алегарычных кампазіцыяў і сімволікі для Віленскага гандлёва-прамысловага дому. Тады ж, у 1930-я гады, зрабіў сграфіта на адміністрацыйным будынку, што на вуліцы Дамініканскай. У агульную, трохколерную кампазіцыю расліннa-дэкаратыўнага арнаменту, побач з нябесным апекуном Вільні, навечна пасяліў Скарынаўскі відарыс, што, дарэчы, захаваўся да сёння.

Паланёны творчасцю, Горыд, відаць, толькі і жыў, што спалучэннямі колераў, іх сугуччамі, дысанансными выбухамі плямаў, звівамі ліній, рытмамі, глыбінямі, святлом і ценем.

## Апошняя стацыя мастака

Здавалася б, усё здзяйснялася... Надзвычай запатрабаваны мастак еўрапейскага ўзроўню — ілюстратар, графік-станкавіст, жывапісец, манументаліст шырокага абсягу (фрэскі, вітражы, сграфіта) — Язэп Горыд быў на кані...

Усвядоміўшы з юнацтва, што тэма і змест мастацтва — Чалавек (у якім бы жанры ні працаваў!), Горыд быў схільны да партрэтнага жывапісу. І сярод яго мадэляў былі характары і тыпы розныя, тыя, хто меў разуменне і мажлівасць годна аддзячыць за зробленую працу. (Ёсць партрэты мастака ў прыватных зборах у Літве і Польшчы. Партрэты найбольш санавітых замоўцаў — контр-адмірала Ёзэфа Унруга, віцэ-адмірала Ежы Свірскага — былі напісаныя ў Варшаве і захоўваюцца ў Нацыянальным музеі).

Але Горыда не пакідала адчуванне, што чагосьці не хапала для поўнага трыумфу і душэўнай раўнавагі. Відаць, мастак і сам не мог зразумець, што карцела ў душы... Гэта адчуваецца ў невялічкім артыстычным, «як бы выпадковым», медзярыце «Аголеная» з аўтарскай пазнакай: «1936 год». Чым ёсць па сутнасці гэтая эмацыянальна імпульсіўная, спружыністая натурная кампазіцыя? Роздум пра нязДзейсненае ці страчанае? Партрэт псіхалагічнага стану? Безумоўна. Вось толькі мадэлі ці мастака?

Няпоўгі век светла-русявага мастака, з дагледжанай фрызурай, трохі вышэй сярэдняга росту, з графічна чыстым, адкрытым і мужным тварам, з якога засяроджана глядзяць пільныя вочы, трагічна абарваўся пад бомбамі другой сусветнай вайны. У верасні 1939 года.

▸ СПАДЧЫНА

# НАШЧАДАК КНЯЗЯ ВІТАЎТА

Кастусь ТАРАСАЎ

**Пасля смерці Вітаўта ў Вялікім княстве Літоўскім разгарнулася барацьба паміж Свідрыгайлам Альгердавічам і Жыгімонтам Кейстутавічам. Яна была падобная на вайну, што вялася паміж Вітаўтам і Ягайлам за 40 гадоў да гэтага, толькі скончылася драматычна для ўсёй гісторыі Вялікага княства.**


Князь Свідргайла


Князь Жыгімонт


Князь Ягайла


Пячатка князя Жыгімонта

## Князь Свідрыгайла

Вітаўт памёр у кастрычніку 1430 года. Усяго дзесяць дзён спатрэбілася, каб са згоды Ягайлы вялікім князем быў вылучаны Свідрыгайла. Па-першае, ён быў Альгердавіч — малодшы брат Ягайлы, па-другое, ён вельмі хацеў захапіць уладу і абяцаў абараняць польскія інтарэсы — аддаць палякам Падолле, не браць у раду праваслаўных, не мірыцца з крыжакамі. Яго абяцанні трымаліся ў паветры да таго дня, пакуль ён не ўздзеў вялікакняжацкую карону.

Без малога трыццаць гадоў чакаў Свідрыгайла гэтай хвіліны, і са стараннасцю пачаў рабіць сваё насуперак Ягайлу. Адразу ж развязаў вайну з палякамі за Падолле, тут жа склаў мір з крыжакамі, калі яны пайшлі вайной на Польшчу, прызначаў намеснікамі праваслаўных. Гарадзельская унія растоптвалася князем, паўвекавыя высілкі палякаў прывязаць Вялікае княства да Кароны руйнаваліся.

Абразуміць малодшага брата вырашыў кароль Ягайла. Яму было восемдзесят гадоў, дарога далася яму нялёгка, ён прыбыў у Вільню моцна стомленым. Але кароль апынуўся ў падзямеллі, дзе паўстагоддзя таму трымаў яго князь Кейстут за змову з крыжакамі. Ягайла зразумеў, што малодшы брат помсціць яму за сваё васьмігадовае зняволенне ў Крамянцы і гатовы пратрымаць яго ў склепе да смерці. Кароль зламаўся, яго ліст адвезлі ў Кракаў, і радныя паны, ратуючы жыццё Ягайлы, пагадзіліся са стратай Падолля і самастойнай уладай вялікага князя.

Кароль здабыў волю, але тут Свідрыгайла памыліўся, паколькі гэта развязала рукі яго супернікам. Палякі і баяры-каталікі склалі змову, вырашыўшы перадаць вялікакняжацкую карону Жыгімонту Кейстутавічу. Завіхаўся ў змове і князь Сямён Гальшанскі. Дачка Сямёна, Соф'я, была жонкай Ягайлы, і князь Сямён марыў, каб хто-небудзь з яго дваіх унукаў узяў пасля карону Вялікага княства.

Свідрыгайлу запрасілі ў Брэст на сустрэчу з Ягайлам і вялікім магістрам. Не чуючы падвоху, ён выступіў у шлях з атрадам аховы. Але ў Ашмянах на князя Свідрыгайлу раптам напаў атрад Сямёна Гальшанскага. Вялікі князь збег у Віцебск.

## Князь Жыгімонт

У гэты час у Вільні сеў вялікім князем Жыгімонт. Гэта не было падарункам для Ягайлы, таму што Жыгімонт быў спадчыннікам Вітаўта, які ў свой час дамогся самастойнага праўлення ў ВКЛ. Праўда, Жыгімонт прасіў караля не турбавацца — маўляў, ён адменіць усё змены Свідрыгайлы, трэба трохі пачакаць, пакуль у Вялікім княстве ёсць два вялікіх князя, бо між імі пачалася вайна. Сілы супернікаў былі роўныя, і ні адзін не жадаў саступіць.

У 1434 годзе, ужо па смерці Ягайлы, калі ў Польшчы кіравалі радныя паны, Свідрыгайла задумаў рэальны, на яго погляд, план для вяртання кароны. Ён вырашыў ажыццявіць унію цэркваў. Як выканавец жадання Рымскай царквы, ён мог разлічваць на падтрымку Папы, а як супернік Гарадзельскай уніі — на дапамогу імператара Сігізмунда і Тэўтонскага ордэна. Але для царкоўнай уніі неабходна была згода мітрапаліта Літоўскай Русі Герасіма.

Свідрыгайла пачаў дамаўляцца з ім і адначасова разаслаў на каралеўскія двары лісты пра тое, што рыхтуе аб'яднанне цэркваў. Імператар Сігізмунд адразу ж паабяцаў яму каралеўскую карону. Ордэн накіраваў прасіцельны ліст у Рым. З Рыма дайшлі пасланні камянецкаму біскупу, каб пагадзіў супрацьстаялых вялікіх князёў, і мітрапаліту Герасіму з благаслаеннем на унію.

Польскія паны не маглі пагадзіцца на каранаванне Свідрыгайлы — гэта азначала б адпадзенне Вялікага княства ад Польшчы, а Жыгімонт Кейстутавіч не жадаў дапускаць суперніка ў Вільню. У беларускіх гарадах, дзе Свідрыгайла лічыўся абаронцам праваслаўя, прыняць карону з рук імператара-каталіка было нельга. Герасім, адчуваючы, што старанні аб саюзе з каталіцкай царквой пазбавяць яго даверу сярод праваслаўнага духавенства, адмовіўся дапамагаць Свідрыгайлу. Ведаючы мсцівасць вялікага князя, ён увайшоў у змову са смаленскімі баярамі наконт выдачы Свідрыгайлы вялікаму князю Жыгімонту. Але смаленскі намеснік Юрый Бутрым выдаў змоўшчыкаў. Мітрапаліта Герасіма ў ланцугах адвезлі ў Віцебск да Свідрыгайлы.

## Бітва на Святой

Улада двух князёў доўжыцца не магла, і надышоў час вырашаць спрэчку бітвай. 1 верасня 1435 года супернікі сустрэліся на рацэ Святой. Жыгімонту палякі далі ў дапамогу восем тысяч рыцараў. Свідрыгайла вывеў пяць харугваў — Смаленскую, Віцебскую, Полацкую, Мсціслаўскую, Кіеўскую. Яму дапамагаў князь Жыгімонт Карыбут, які прывёў атрады селезцаў, чэхаў і ракушан. І яшчэ дашлі на падмогу лівонскія харугвы і харугва шведаў.

Нешта фатальнае было ў натуры Свідрыгайлы, пячатка няўдачы абавязкова клалася на ўсе яго важныя справы. Напярэдадні бітвы ён не ўтрымаўся здзейсніць кару, якая абарвала прыязнасць да яго праваслаўных палкоў. Па яго загаду мітрапаліт Герасім на рынкавым пляцы ля мосту праз Віцьбу быў спалены жывым.

Але войскі сышліся, больш за дваццаць тысяч людзей чакалі знака на бітву. Гуфы Жыгімонта Кейстутавіча раптам натапырыліся дзідамі і, набіраючы разгон, пайшлі наперад; ім насустрач прыпусцілі рыссю паліцы Свідрыгайлы. Абапал загрымела: «Бі! Сячы!»

У гэтай бітве перамог вялікі князь Жыгімонт, перамоханы Свідрыгайла збег да малдаўскага гаспадара. Жыгімонт пачаў кіраваць аднаасобна, пасля бітвы на Святой адправіў польскіх рыцараў на радзіму і быў вольны.

Адразу думкі Жыгімонта і Свідрыгайлы перамяніліся на зваротныя. Свідрыгайла так жадаў застацца вялікім князем, што таемна абяцаў палякам далучыць да Польшчы ўсё Вялікае княства Літоўскае. Радныя паны не вельмі верылі яму, таму што ён іх падмануў, калі ў першы раз стаў князем. Можа, ён далучыў бы Вялікае княства да Польшчы, але ў яго не было досыць палкоў для такой дзёрзкай задумы.

У Жыгімонта быў сын Міхаіл. І ён пачаў рабіць усё, каб перадаць уладу сыну. Да 1439 года ў яго з'явіліся антыпольскія настроі, якія ён нават не збіраўся хаваў. Паны і намеснікі Вялікага княства, схільныя прыслухвацца да польскага боку, не адважыліся ўспамінаць пры ім, што ён абяцаў каралю Ягайлу за 8 тысяч войска, якое перамагло Свідрыгайлу. Усім падавалася, што менавіта Польшча павінны шукаць выйсце, каб загубіць непаслухмянага князя.

## Забойства

Але ў 1440 годзе па змове валынскіх праваслаўных князёў Жыгімонт быў забіты. Мабыць, гэта здарылася не без згоды Свідрыгайлы. Выканаць забойства ўзяўся малады князь Аляксандр Чартарыйскі. Ён не ўяўляў таго, што наступіць пасля смерці Жыгімонта. На розум Чартарыйскага здавалася, што адзіны прэтэндэнт на ролю вялікага князя Свідрыгайла. Але той жыў далёка ад Трокаў і не памкнуўся ў тыя дні на радны савет, калі князь Чартарыйскі прывёз у замак сенны абоз у трыста падвод, на кожнай з якіх быў схаваны ваяр.

Чартарыйскі і памагаты яму шляхціц Скабейка знайшлі Жыгімонта ў капліцы. Дзверы была зачыненая знутры. У гэта імгненне Чартарыйскі ўбачыў, што па двары ходзіць любімы Жыгімонтаў мядзведзь, і зашкрабаў аб дзверы пазногцямі. Жыгімонт адчыніў дзверы, Чартарыйскі і Скабейка зайшлі, і Чартарыйскі ўдарыў Жыгімонту качаргой.

Гэта было другое пасля задушэння Кейстута забойства вялікага князя. Уся краіна была здзіўленая. Пазней летапісцы на ўгоду сваім вяльможным апекунам напісалі, што Жыгімот забіў незлічоную колькасць паноў, чым і заслужыў такую смерць. Але імёнаў гэтых паноў летапісцы так і не паставілі.

Вось толькі Аляксандр Чартарыйскі, змушаны быў пасля забойства Жыгімонта збегчы з ВКЛ, знайшоў прыстанак у галіцкага князя Дзмітрыя Шамякі. Маскоўскі князь Васіль у 1443 годзе нават накіроўваў Аляксандра ў Пскоў сваім паслом. Праз чатыры гады ён даў згоду быць намеснікам вялікага князя маскоўскага ў Ноўгарадзе, хадзіў з наўгародцамі на немцаў, на лівонскага магістра і шведскага караля. Узімку 1456 года князь Аляксандр камандаваў наўгародскім войскам падчас вайны паміж Ноўгарадам і Масквой. Па патрабаванні маскоўскага князя ён быў выгнаны за гэта з Ноўгарада і сеў княжыць у Пскове. У 1460 годзе, калі маскоўскі князь прыбыў у Ноўгарад, пскавічы паслалі да яго пасаднікаў аб сцвярджэнні Чартарыйскага намеснікам. Але князь Аляксандр адпрэчыў гэтую ўмову і пакінуў Пскоў. Дзе ён жыў пасля Пскова, невядома.

## Казімір, сын Ягайлы

Пасля смерці Жыгімонта радныя паны прапанавалі ў вялікія князі яго сына Міхаіла. Гэта быў лепшы варыянт развіцця падзей для ўсяго ВКЛ. Міхаіл быў разумны, асцярожны, ведаў, што Польшча жадае паглынуць Вялікае княства. Але шляхта, арганізаваная Сямёнам Гальшанскім, бацькам польскай каралевы і дзедам яе ўнукаў, назвала князем Літвы і Русі малодшага сына Ягайлы — Казіміра. У чатырнаццаць гадоў яго прывезлі на гэтую ўрачыстасць.

Ніколі раней за 200 гадоў Вялікага княства Літоўскага няпоўнагадовы хлопец не быў вялікім князем. Гэта парушала векавую традыцыю і звычаі. Але зараз хлопчыку далі меч вялікага князя, увянчалі яго каронай, пасадзілі на трон, і ўсе князі і баяры былі павінны яго слухацца.

У 1444 годзе, калі брат Казіміра, 22-гадовы польскі кароль загінуў пад Варнай у бітве з туркамі, палякі абвясцілі Казіміра польскім каралём і вялікім князем Літвы.

Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае засталося без уласнага кіравання, двор перамясціўся ў Кракаў.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 290
Падпісана да друку 2.04.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.